Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЛЮТАГА 2018 г. СЕРАДА № 26 (28642)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Назначаны новыя кіраўнікі цэнтральных СМІ**

СТАР. 2



**Абяцаная інфляцыя не перавысіць 6 %**

СТАР. 4



**Конкурс «Хто каго» як трэнінг для мазгоў**

СТАР. 12

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«Колькі чалавек можа трапіць пад дзеянне Дэкрэта № 1? Калі зыходзіць з балансу працоўных рэсурсаў Беларусі (пакуль у нас ёсць выніковыя звесткі толькі за 2016 год, за 2017-ы будуць крыху пазней), то гэта можа быць прыкладна 250 тысяч чалавек. Мы пра іх чамусьці не ведаем. Гэта значыць, афіцыйная статыстыка не ведае, чым яны займаюцца. Так, магчыма, гэта мігранты, якія з'ехалі. Безумоўна, там будзе і частка людзей, якія знаходзяцца ў цені. Тыя, хто працуе нелегальна або без афармлення працоўных адносін, або сам на сябе, не рэгіструючыся ні рамеснікам, ні індывідуальным прадпрымальнікам. Такія людзі будуць. Пад дзеянне дэкрэта трапяць тыя, хто знаходзіцца ў працаздольным узросце, у самым росквіце сіл і гадоў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9894 | ▲ |
| Еўра | 2,4666 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0348 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0722 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Прэм'ера рубрыкі: фота на трынаццатую

# Бабулін заплыў



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Гэтым фотаздымкам, выкананым маладым фотакарэспандэнтам Ганнай Занкавіч, «Звязда» прэзентуе новую рубрыку «Фота на трынаццатую», пад якой на, вядома ж, 13-й старонцы газеты кожную сераду будуць друкавацца матэрыялы нашых фотакараў — рэпартажы, тэматычныя падборкі, фотафакты з падзей і проста эмацыянальныя моманты з жыцця. Звяздоўскія фоталетапісцы, а іх у штаце рэдакцыі пяцёра, не толькі паспяваюць сачыць за шматлікімі падзеямі, выязджаюць у рэгіёны краіны, ілюструюць матэрыялы сваіх калег, але ўносяць свой уклад і ў творчы працэс стварэння газетнай прасторы, выступаюць з асабістымі тэмамі і фотапраектамі. У скарбонках нашых маладых і сталых майстроў назапашваецца нямала змястоўных здымкаў. Тым больш што ў сучасным жыцці фатаграфія заваёўвае ўсё большую папулярнасць: гаворачы слэнгавай мовай, фотаздымак сёння ў трэндзе. Спадзяёмся, адкрываючы новую фота-старонку, «Звязда» і надалей пойдзе ў нагу з сучаснымі тэндэнцыямі.

Не сакрэт, здымкі, удала схопленыя альбо падгледжаныя ў віры жыцця, не патрабуюць расшыфроўкі і тлумачэнняў. Сама па сабе фатаграфія з'яўляецца і словам, і фактам, і жэстам. Вось і гераіня першапалоснага фотаздымка сваім жыццесцвярджальным жэстам жадае новай рубрыцы цікавага і плённага шляху да чытача.

Такім чынам, гартайце, знаходзьце і глядзіце нашу 13-ю старонку!

**Анатоль КЛЯШЧУК, загадчык аддзела фотаілюстрацыі.**

■ Размова па сутнасці

# САКРЭТЫ КНІЖНАГА СВЕТУ

## Як выдаўцам, гандлярам і аўтарам знайсці агульную мову?

**Зусім хутка ў культурна-асветніцкім жыцці нашай краіны адбудзецца важная падзея — XXV Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Месцам сустрэчы выдаўцоў, кнігагандляроў, аўтараў, літаратурных крытыкаў і, вядома ж, чытачоў стане выставачны цэнтр «БелЭкспа», што па адрасе праспект Пераможцаў, 14. Там будуць адбывацца і гучныя кніжныя прэзентацыі, і гарачыя літаратурныя дыскусіі, і актуальныя публічныя чытанні. Чым сёння жыве айчынная кніжная сфера, з якімі праблемамі сутыкаецца і якія мае дасягненні, напярэдадні выстаўкі, абмеркавалі за круглым сталом у Выдавецкім доме «Звязда». «Беларуская кніга ў сучасным грамадстве» — так была акрэслена тэма. І яна аказалася надзвычай актуальнай — выдаўцам нават не было часу расказаць пра свае навінкі, бо хацелася абмеркаваць самыя важныя пытанні.**

СТАР. 8-9



Фота БЕЛТА.

# НОВЫЯ КІРАЎНІКІ Ў МЕДЫЯСФЕРЫ

## Учора Прэзідэнт здзейсніў кадравыя перастаноўкі ў шэрагу вядучых рэспубліканскіх СМІ

**У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка назначыў новых кіраўнікоў Белдзяржтэлерадыёкампаніі і газеты «СБ. Беларусь сегодня» — Івана Эйсманта і Дзмітрыя Жука адпаведна і ўзгадніў назначэнне Ігара Луцкага генеральным дырэктарам тэлеканала СТБ. Яшчэ адно кадравае рашэнне — Мікалай Латышонак назначаны памочнікам Прэзідэнта па агульных пытаннях.**

Звяртаючыся да новага кіраўніцтва СМІ, Прэзідэнт адзначыў, што іх папярэднікі на гэтых пасадах Генадзь Давыдзька, Павел Якубовіч, Юрый Казіятка — «людзі дастойныя, і ў сувязі з гэтым іх нельга страціць».

Генадзь Давыдзька, які дагэтуль кіраваў Белдзяржтэлерадыёкампаніяй, са студзеня старшынствуе ў грамадскім аб'яднанні «Белая Русь». «Дарэчы, самадастатковае грамадскае аб'яднанне, наколькі я інфармаваны, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — У іх дастаткова членскіх узносаў, каб утрымліваць сябе і праводзіць вялікую дабрачынную работу. Таму выбранне яго кіраўніком — гэта, напэўна, крок у правільным кірунку».

Павел Якубовіч, былы галоўны рэдактар «СБ. Беларусь сегодня», быў абраны старшынёй грамадскага савета пры МУС. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што «ў яго вялікі кавалак работы. І гэту работу трэба ўзмацніць. Гэта штосьці блізкае кантролю за праваахоўнымі органамі. Балазе, што не я ініцыяваў гэты грамадскі савет пры МУС, а самі міліцыянеры». Аляксандр Лукашэнка лічыць, што паўнамоцтвы і функцыі гэтага грамадскага савета можна пашырыць, мабыць, дадаўшы людзей, каб ён меў кантрольныя функцыі паміж грамадскасцю і праваахоўнымі органамі.

«Таму ў Паўла Ізотавіча таксама работы хопіць. Я думаю, ён не сыдзе ад сваёй прафесійнай дзейнасці. І Давыдзька, і ён, як я ўжо казаў, павінны ў СМІ працаваць і супрацоўнічаць з імі. У якой форме — трэба вызначыцца, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Што датычыцца Давыдзькі, я думаю, яго статус трэба павышаць. І разгледзець пытанне, унесці прапанову аб яго накіраванні ў Савет Рэспублікі сенатарам. Гэта ўзмоцніць яго пазіцыі. Я не выключаю, што і Павел Якубовіч зможа там працаваць. Нам вельмі патрэбны вопытныя людзі». Юрый Казіятка, які быў генеральным дырэктарам ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне», ужо працаваў у пятым скліканні Савета Рэспублікі. «Галоўнае, што гэта надзейныя людзі. Усе трое», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка спадзяецца, што з прыходам новых кіраўнікоў СМІ перамены адбудуцца там, дзе неабходна, але «без кадравых надломаў». Прэзідэнт параіў звярнуць увагу на найлепшы замежны вопыт. Напрыклад, кіраўнік дзяржавы адзначыў работу апаратараў на расійскіх тэлеканалах. «Таму выбірайце ўсё найлепшае і дзейнічайце», — сказаў беларускі лідар.

Іван Эйсмант у гутарцы з журналістамі звярнуў увагу на тое, што кіраўнік дзяржавы паставіў задачу рабіць тэлебачанне сучасным — як па відэа, так і па змесце, каб яно было канкурэнтаздольным у параўнанні з тэлеканаламі суседніх краін. Новы старшыня Белтэлерадыёкампаніі адзначыў, што, калі рухацца ў гэтым кірунку, вядома, патрэбны будуць нейкія рэформы, але пры гэтым людзі не павінны быць пакрыўджаны. Ігар Луцкі, новы кіраўнік СТБ, расказаў, што Прэзідэнт адной з задач паставіў развіццё нацыянальнага кантэнту. Акрамя таго, важна паказваць ролю чалавека працы ў развіцці дзяржавы. Галоўны рэдактар «СБ. Беларусь сегодня» Дзмітрый Жук адзначыў, што, каб быць максімальна аб'ектыўным, сумленна паказваць жыццё, неабходна слухаць і чуць, улічваць інтарэсы грамадзян.

Назначаючы Мікалая Латышонка памочнікам Прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Памочнік па агульных пытаннях — гэта пытанні «ад зямлі да неба», усе пытанні, якімі займаецца Прэзідэнт». Мікалай Латышонак добра знаёмы з тым, чым ён будзе займацца на новай пасадзе, паколькі раней па рабоце знаходзіўся ў кантакце з памочнікамі Прэзідэнта. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на ўзаемадзеянне з памочнікамі Прэзідэнта ў рэгіёнах: інфармацыя ад іх павінна дакладвацца апаратыўна.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### НАЙБАГАЦЕЙШЫЯ ЛЮДЗІ СВЕТУ ЗА ДЗЕНЬ СТРАЦІЛІ 114 МІЛЬЯРДАЎ ДОЛАРАЎ



**Падзенне фондавага рынку ў ЗША ў панядзелак, 5 лютага, за дзень паменшыла багацце 500 самых багатых людзей свету на $114 млрд, паведамляе агенцтва Bloomberg. Аптымізм, звязаны са зніжэннем падаткаў, з-за якога ў студзені на рынку былі зафіксаваны прыкметныя поспехі, цяпер саступіў месца асцярогам адносна інфляцыі, тлумачыць Bloomberg.**

Больш за ўсё пацярпеў заснавальнік і кіраўнік амерыканскай інвесткампаніі Berkshire Hathaway Уорэн Бафет. Яго багацце, якое Bloomberg называе трэцім па велічыні ў свеце, за 5 лютага скарацілася на $5,1 мільярда і цяпер складае $85 млрд.

Разам з заснавальнікам Berkshire Hathaway за адзін дзень больш за $1 млрд, паводле інфармацыі Bloomberg, страцілі яшчэ 17 мільярдэраў, у тым ліку кіраўнік Facebook Inc. Марк Цукерберг. Яго багацце 5 лютага стала меншым адразу на $3,6 млрд (другі па велічыні паказчык скарачэння капіталу ў свеце ў гэты дзень) і зараз складае $74,7 млрд.

Страт не пазбег і найбагацейшы чалавек у свеце, заснавальнік Amazon Джэф Безас, чый капітал скараціўся на $3,3 млрд — да $116,4 млрд (трэці паказчык у свеце).

### У ЕС МОГУЦЬ АДМОВІЦЦА АД ПЕРАХОДУ НА ЛЕТНІ ЧАС

**Дэпутаты Еўрапарламента 8 лютага правядуць дэбаты па адмене пераходу на летні час, у гэты ж дзень пройдзе галасаванне па адпаведнай рэзалюцыі, паведамляе LETA.**

Рэзалюцыя была падрыхтавана камітэтам Еўрапарламента па пытаннях транспарту. Пры яе прыняцці краіны ЕС застануцца ў зімовым часе.

Пытанне было ўзнята пасля паступлення мноства петыцый ад жыхароў краін ЕС. Грамадзяне скардзяцца, што змяненне часу два разы ў год адмоўна ўплывае на іх здароўе. Напрыклад, Фінляндыя заявіла, што будзе дабівацца адмены летняга часу ў ЕС пасля таго, як больш за 70 тысяч фінаў падпісалі адпаведную петыцыю. Жыхары Латвіі і Эстоніі таксама супраць пераводу гадзіннікавых стрэлак, сцвярджаючы, што пераход на зімовы і летні час дрэнна ўплывае на здароўе.

Пераход усіх краін ЕС на летні і зімовы час рэгулюе дырэктыва Еўрапарламента і Савета ЕС ад 19 студзеня 2011 года. Упершыню пераходзіць на летні і зімовы час пачалі ў 1908 годзе ў Вялікабрытаніі, каб эканоміць электраэнергію. Цяпер стрэлкі гадзіннікаў сезонна пераводзяць больш за 100 краін свету. У Беларусі ад пераходу на летні і зімовы час адмовіліся ў 2011 годзе.

### CNN: ІВАНКА ТРАМП УЗНАЧАЛІЦЬ ДЭЛЕГАЦЫЮ ЗША НА ЗАКРЫЦЦІ АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ У ПХЁНЧХАНЕ



**Дональд Трамп асабіста звярнуўся да дачкі з адпаведнай просьбай.**

Дачка прэзідэнта ЗША і яго старшы саветнік Іванка Трамп узначаліць амерыканскую дэлегацыю на цырымоніі закрыцця зімовых Алімпійскіх гульняў у паўднёвакарэйскім Пхёнчхане. Пра гэта паведаміў тэлеканал CNN са спасылкай на крыніцу ў Белым доме.

Паводле яго інфармацыі, Дональд Трамп асабіста звярнуўся да дачкі з адпаведнай просьбай. Яна таксама мае намер прысутнічаць на некаторых спаборніцтвах, у якіх будуць удзельнічаць спартсмены з ЗША, адзначае тэлеканал.

Як раней заявіла прэс-служба Белага дома, на цырымоніі адкрыцця Алімпійскіх гульняў дэлегацыю ЗША ўзначаліць віцэ-прэзідэнт краіны Майкл Пенс.

■ Блізкая ўлада

# ЯК УЛАДКАВАЦЬ ДЗІЦЯ Ў САДОК?

## На Міншчыне за тры гады плануюць вырашыць гэтае пытанне



Фота БЕЛТА.

**Больш за пяцьдзясят прадстаўнікоў рэспубліканскіх і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі прынялі ўдзел у выязной прэс-канферэнцыі старшыні Мінаблвыканкама Анатоля Ісачанкі ў Жодзіне. Пытанні ўзнімаліся самыя розныя, сярод іх — далейшае развіццё буйных населеных пунктаў Міншчыны, стварэнне камфортных умоў пражывання для насельніцтва, добраўпарадкаванне тэрыторый, будаўніцтва дашкольных устаноў.**

У прыватнасці, у Фаніпалі пражывае 16 тыс. чалавек, аднак інфраструктура не разлічана на такую колькасць людзей. Шмат праблем і ў Мінскім раёне. Многія жыхары гэтага рэгіёна працуюць у Мінску і, зразумела, падаткі плацяць у бюджэт горада. Разам з тым на прамую тэлефонную лінію аблвыканкама часта звяртаюцца жыхары населеных пунктаў раёна са скаргамі на дрэнныя дарогі, асвятленне вуліц, недахоп месцаў у садках і школах, спецыялістаў у паліклініках. Атрымліваецца, што ўсімі пытаннямі так ці інакш займаюцца мясцовыя ўлады. Зразумела, што сродкаў на вырашэнне ўсіх праблем у раённым бюджэце не хапае. Ці бярэ на сябе часткова клопат аб сваіх работніках Мінгарвыканкам, ці разглядалася пытанне ўзаемадзеяння абласных і сталічных уладаў па добраўпарадкаванні раёна, пацікавіліся журналісты.

— Людзі працуюць у Мінску — гэта добра. Але ж і сталічныя жыхары таксама едуць працаваць у вобласць: Смалявічы, Дзяржынск, Жодзіна. Што датычыцца дапамогі Мінгарвыканкама, то ў нас наладжана супрацоўніцтва ў тых ці іншых кірунках. І неабавязкова сродкі ідуць на добраўпарадкаванне, — адзначыў Анатоль Ісачанка.

«Мы добра ведаем праблемы Мінскага раёна. І паступова будзем іх вырашаць, у тым ліку і па адкрыцці новых дзіцячых дашкольных устаноў, — адзначыў губернатар. — Увогуле ў Мінскай вобласці каля пяці тысяч выхаванцаў маюць патрэбу ў месцах у дзіцячых садках. На працягу трох гадоў праблему плануецца вырашыць. Сёлета пачнецца будаўніцтва некалькіх дзіцячых дашкольных устаноў, у прыватнасці, у такіх буйных населеных пунктах, як Фаніпаль, Бараўляны, якія практычна сталі пайнавартаснымі гарадамі».

Летась у Мінскай вобласці ўведзены ў дзеянне новыя дзіцячыя садкі ў аграгарадку Прылукі на 150 месцаў, у вёсцы Копішча, гарадах Жодзіна і Стоўбцы на 230 месцаў у кожным. Дзіцячы сад-яслі на 154 месцы адкрыты таксама на базе былога дзіцячага дома ў Жодзіне.

Спыніўся Анатоль Ісачанка і на пытаннях навядзення парадку і добраўпарадкавання буйных населеных пунктаў Міншчыны. Работы будуць працягвацца ў аграгарадку Лясны і вёсцы Бараўляны, горадзе Жодзіна. У мінулым годзе пачалося ўладкаванне пасёлка Калодзішчы. Сёлета яно працягнецца, на гэта будуць выдзелены сродкі.

Губернатар нагадаў, што ў мінулым годзе шмат зроблена па добраўпарадкаванні Смалявіч. І не толькі таму, што тут праходзілі абласныя «Дажынкі», а для таго, каб акумуляваць сродкі і прывесці горад у належны выгляд. Дарэчы, сёлета фестываль працаўнікоў сяла прыме Мядзел. Ужо выдзелены неабходныя фінансавыя рэсурсы. «Мяркую, што горад стане прыгажэйшы і ўтульнейшы, — дадаў Анатоль Ісачанка.

**«Увогуле ў Мінскай вобласці каля пяці тысяч выхаванцаў маюць патрэбу ў месцах у дзіцячых садках. На працягу трох гадоў праблему плануецца вырашыць. Сёлета пачнецца будаўніцтва некалькіх дзіцячых дашкольных устаноў».**

Ну і, вядома, разам з развіццём сацыяльнай сферы павінен паляпшацца дабрабыт жыхароў вобласці. Не апошняе месца тут адыгрывае магчымасць працаўладкавання і заробкаў. Па словах Анатоля Ісачанкі, заданне па адкрыцці 10 тысяч рабочых месцаў павінны выканаць за кошт адкрыцця новых вытворчасцяў і прадпрыемстваў, а таксама — развіцця прадпрымальніцтва. Апошнім часам кіраўнік дзяржавы прыняў шэраг дакументаў, якія прадугледжваюць актывізацыю дзелавой ініцыятывы, падтрымку тым, хто мае намер адкрыць сваю справу. «Наша задача актывізаваць гэтую работу і падказаць чалавеку, куды можна звярнуцца па садзейнічанне», — рэзюмаваў Анатоль Ісачанка.

Не абышлі ўвагай журналісты і пытанне падрыхтоўкі да сяўбы. Старшыня Мінаблвыканкама запэўніў, што яна ідзе ў планавым парадку. А па назапашванні мінеральных угнаенняў Міншчына ў лідарах.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ Ведай нашых!

# АДЗНАЧЫЦЬ ВЫСАКАРОДНАСЦЬ

### Беларуская асацыяцыя спартыўнай прэсы намінавала Дар'ю Домрачаву на прыз World Fair Play Awards імя П'ера дэ Кубертэна

**«Заяўка адпраўлена ў міжнародны камітэт Fair Play (CIFP) у Будапешт. Ініцыятыву падтрымалі ўсе члены Беларускай асацыяцыі спартыўнай прэсы», — адзначыла старшыня асацыяцыі Анастасія Марыніна.**


Фота БЕЛТА.

Канчатковае рашэнне аб прысуджэнні прыза World Fair Play стане вядома ў канцы 2018 года.

Нагадаем, у ходзе гонкі праследавання на этапе Кубка свету ў Антхольцы Домрачава не стала перад фінішам апярэджваць італьянку Даратэю Вірэр, з рукі якой (па віне Дар'і) выпала лыжная палка. Беларуска фінішавала трэцяй, услед за Вірэр.

Міжнародны камітэт Fair Play ўручае ўзнагароды ў трох намінацыях: імя П'ера дэ Кубертэна (заснавальнік сучасных Алімпійскіх гульняў) — спартсмену або камандзе за значны акт fair play, імя Жана Баротра (французскі тэнісіст) — спартсмену за жыццё і кар'еру ў духу fair play, імя Вілі Даўме (віцэ-прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта ў 1972—1976 гадах, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта ФРГ у 1961—1992 гадах) — арганізацыі або спартсмену за прапаганду ідэй fair play. Яшчэ адзін прыз уручаецца маладым спартсменам пад патранажам прэзідэнта МАК.

З беларускіх спартсменаў World Fair Play Awards (імя Жана Баротра) раней атрымліваў барэц вольнага стылю Аляксандр Мядзведзь (у 1983 годзе). Прадстаўнік настольнага тэніса Уладзімір Самсонаў у 2005 годзе атрымаў прыз Fair Play ад Міжнароднага алімпійскага камітэта. Дыпломам Fair Play за ўчынак на Еўрапейскіх гульнях—2015 быў узнагароджаны самбіст Сцяпан Папоў (2016 год).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■

# ШКОЛЬНІКІ НЕ ВЕДАЮЦЬ БЕЛАРУСКІХ ПРЫМАВАК?

### У Магілёве ўзнагародзілі пераможцаў 17-га Беларускага пяціборства

**У чарговых іспытах, якія прайшлі на базе МДУ імя А. Куляшова, удзельнічалі 20 школьнікаў і ліцэістаў Магілёўшчыны.**

На працягу дзвюх гадзін яны павінны былі даць правільныя адказы на пытанні па пяці прадметах — матэматыцы, прыродазнаўстве, гісторыі, беларускай літаратуры і мове. Абсалютным пераможцам стаў адзінаццацікласнік 21-й сярэдняй школы з Магілёва Ілья Касакоў, які чацвёрты раз удзельнічаў у пяціборстве. Дарэчы, аднойчы ён ужо лідзіраваў у гэтых іспытах і двойчы займаў другое месца. Другім пасля Ільі стаў дзевяцікласнік Сямён Гарох з Дараганаўскага ВПК дзіцячы сад-сярэдняя школа Асіповіцкага раёна — ён прымаў удзел у гэтых выпрабаваннях ужо другі раз. На трэцім месцы трохразовы удзельнік спаборніцтваў — адзінаццацікласнік Мацвей Дашкевіч з Мсціслаўскай сярэдняй школы № 2. Дарэчы, летась ён заняў першае месца і паставіў новы рэкорд, набраўшы 217 балаў з магчымых 300.

— Гэтыя спаборніцтвы дапамагаюць юнакам і дзяўчатам яшчэ раз праверыць свае веды, — адзначыў **арганізатар Беларускага пяціборства Міхась БУЛАВАЦКІ**. — Звычайна на іх прыязджаюць дастаткова моцныя школьнікі. Але нават ім часам цяжка бывае адказаць на зусім здавалася б простыя пытанні. Гэтым разам, напрыклад, толькі тры чалавекі справіліся з заданнем па літаратуры, дзе трэба было назваць прозвішча беларускага аўтара, нобелеўскага лаўрэата. А прыгадаць пяць беларускіх прымавак ці прыказак змаглі толькі два чалавекі з 20. Яшчэ сем назвалі меней за пяць прымавак і 11 — ніводнай. Так што тут ёсць над чым працаваць.

Усе пераможцы 17-га Беларускага пяціборства атрымалі іменныя медалі, дыпломы з фота, цукеркі і карысныя кнігі, якія дапамогуць ім яшчэ лепей ведаць родную мову і свой край.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Стыхія

# Наш Слаўгарад увайшоў у сусветны топ-5 па ападках

**Беларускі горад Слаўгарад (Магілёўская вобласць) увайшоў у спіс месцаў на Зямлі, дзе за мінулыя суткі (панядзелак) выпала самая вялікая колькасць ападкаў, паведамляе ТАСС.**


Фота БЕЛТА.

Першыя чатыры месцы ў спісе занялі гарады ў еўрапейскай частцы Расіі — Паўлаўскі Пасад (21 мм), Кастрама (20 мм), Нікольск (17 мм) і Спас-Дземенск (16 мм), перадае служба Гідраметцэнтра Расіі. А вось пятае месца заняў беларускі Слаўгарад, у якім выпала 15 мм ападкаў. Лідарамі па маразах у аналагічным рэйтынгу сталі расійскія гарады Верхаянск (мінус 50,5 градуса), Верхнявілюйск (мінус 49 градусаў) і Кюсюр (мінус 48,9 градуса).

Па прагнозах расійскага Гідраметцэнтра, у найбліжэйшы час у Маскве ўзмоцняцца маразы. Цыклон, які прынёс моцныя і працяглыя снегапады, паступова сыходзіць з рэгіёна, пакідаючы халоднае паветра. Затым свой уплыў узмоцніць сібірскі антыцыклон, які забяспечыць марознае надвор'е. Верагодна, гэты антыцыклон часткова зачэпіць і тэрыторыю нашай краіны.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

ГИРИЗ ООО «ГИРИЗ»
ГИДРАВЛИКА: гидроцилиндры, насосы, распределители
РВД и комплектующие
Напорные рукава и шланги
Техпластины
Ремонт гидравлических узлов
ДОСТАВКА ПО ВСЕЙ БЕЛАРУСИ
Самые конкурентные цены
В НАЛИЧИИ МНОГО ТЕХНИКИ ПО ЦЕНАМ ВЕСНЫ 2017 ГОДА
Плуги, бороны, прицепы и полуприцепы. Запчасти к ним.
ВОЗМОЖЕН РАСЧЕТ ВСТРЕЧНЫМИ ПОСТАВКАМИ,
ДОГОВОРАМИ ПЕРЕВОДА ДОЛГА.
+375 44 765 08 65 г. Заславль, ул. Советская, 122, каб 126
girza.by
УНП 691586696

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## УНУТРАНЫМ ВОЙСКАМ — 100 ГАДОЎ

**Нацыянальны банк краіны з 6 лютага выпускае ў абарачэнне памятныя манеты «Унутраныя войскі Беларусі. 100 год».**

Сярэбраная манета — наміналам 20 рублёў, масай 33,63 грама, пробай сплаву 925, дыяметрам 38,61 мм, выпушчана тыражом 1500 штук. Медна-нікелевая — наміналам 1 рубель, масай 13,16 грама, дыяметрам 32,00 мм — тыражом 2000 штук. Манеты маюць форму круга, з пярэдняга і адваротнага бакоў — кант, які выступае па акружнасці. Бакавая паверхня манет з насечкай.

На рэверсе манеты ў цэнтры ў коле з выявай сцяга краіны, выкананага ў геральдычнай стылістыцы, — выява зубра, упісанага ў карту Беларусі, абрамленым прамянямі і лаўровай галінай. Па крузе надпісы: уверсе — УНУТРАНЫЯ ВОЙСКІ. 100 ГОД; унізе — Айчына, Гонар, Абавязак. Манеты адчаканены ў акцыянерным таварыстве «Манетны двор Польшчы» (Варшава) якасцю: сярэбраныя — «пруф», медна-нікелевыя — «пруф-лайк».

**Сяргей КУРКАЧ.**

## IX ВЫШЫНЯ!

**Гарадскі конкурс прафесійнага майстэрства «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі — 2018» у намінацыі «Мы — маладыя» стартаваў у Мінску.**

Мэта конкурсу — раскрыццё і падтрымка творчага патэнцыялу маладых педагогаў, якія працуюць у сталічнай сістэме адукацыі. У конкурсе ўдзельнічаюць 83 маладыя педагогі са стажам работы да трох гадоў з устаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Прадугледжана некалькі намінацый: «Правільнае рашэнне» — для настаўнікаў фізікі, астраноміі, матэматыкі, інфарматыкі; «Калі цябе разумеюць» — для настаўнікаў замежнай мовы; «Разумнае. Добрае. Вечнае» — для настаўнікаў беларускай і рускай моў і літаратуры; «Пачатак пачаткаў» — для настаўнікаў пачатковых класаў; «Свая вышыня» — для настаўнікаў фізічнай культуры і здароўя, дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўкі, працоўнага навучання, чарчэння. Настаўнікі музыкі, выяўленчага мастацтва, айчыннай і сусветнай мастацкай культуры будуць спаборнічаць у намінацыі «Мудрасць у абліччы прыгажосці». Настаўнікі гісторыі, грамадазнаўства, геаграфіі — у намінацыі «Вакол свету». Настаўнікі хіміі і біялогіі — у намінацыі «Звычайны цуд», а выхавальнікі ўстаноў дашкольнай адукацыі — у намінацыі «Дзяцінства. Творчасць. Развіццё».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## МАРЫХУАНА З... АПТЭЧКІ

**Менавіта там хаваў наркатычнае зелле і небяспечны псіхатропны сродак альфа-PVP адзін з кіроўцаў, машыну якога праверылі магілёўскія мытнікі разам з супрацоўнікамі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Магілёўскага аблвыканкама.**

Яшчэ адзін кіроўца з Бабруйска захоўваў марыхуану ў сваім гаражы. Знайсці небяспечнае рэчыва дапамаглі службовыя сабакі. У бабруйчаніна канфіскавана больш за 55 грамаў гэтага сродку. Абодва мужчыны ўзяты пад варту, у адносінах да іх распачаты крымінальныя справы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## АНАБОЛІКАЎ І СТЭРОІДАЎ — НА ПЯЦЬ ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

**Супрацоўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама, Партызанскага РУУС сталіцы разам з работнікамі падатковай інспекцыі затрымалі за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць 26-гадовага жыхара горада.**

Малады чалавек вёў рэалізацыю анабалічных і стэроідных прэпаратаў у таблетках і ампулах без адпаведнай дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці суб'екта гаспадарання і спецыяльнага дазволу. Указаную прадукцыю ён прывозіў з Расіі і прадаваў праз інтэрнэт. Тавару канфіскавалі на агульную суму больш за пяць тысяч рублёў. Як высветлілі аператыўнікі, даход ад незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці з лілеяня мінулага года да студзеня гэтага склаў 989 рублёў. На мужчыну складзены адміністрацыйны пратакол, яму пагражае штраф у памеры 2450 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПРЫКІНУЎСЯ МЁРТВЫМ

**Вядома, што некаторыя птушкі выкарыстоўваюць гэты прыём пры набліжэнні драпежніка. Прытворыцца мёртвай, задзярэ лапкі, ну і крылаты агрэсар можа праляцець міма. А вось на што разлічваў драгічынскі вадзіцель, калі прыкідваўся нежывым, невядома. Няўжо думаў, што супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі паверацЬ у лятальны канец... ды і пойдуць сваёй дарогай?**

Словам, увагу інспектара ДАІ прыцягнуў аўтамабіль маркі «Аўдзі». Міліцыянер падаў знак спыніцца. Але той, хто быў за рулём, націснуў на газ. Да пераследу парушальніка далучыліся яшчэ некалькі экіпажаў, ім удалося нарэшце заблакіраваць непаслухмяную машыну. А калі інспектары падышлі да аўтамабіля, вадзіцель быў не за рулём — ён ляжаў на заднім сядзенні і не падаваў прыкмет жыцця.

Як расказалі ў Брэсцкім абласным упраўленні ДАІ, кіроўцу некалькі разоў прапаноўвалі выйсці з аўтамабіля, але ён не рэагаваў. Ну і падумалі, што чалавеку магло сапраўды стаць дрэнна. Разбілі акно машыны, а вадзіцеля даставілі ў бальніцу. Але там 27-гадовы грамадзянін ад медыцынскага агляду адмовіўся. У адносінах да яго склалі тры адміністрацыйныя пратаколы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## МАЙСТЭРСТВА І ТАЛЕНТ УЗЯЛІ ВЕРХ

**Чэмпіёнам краіны 12-ы раз стаў сталічны гросмайстар Андрэй Валюк.**

У апошнія дні студзеня ў Мінску прайшлі чэмпіянаты Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын. У фінальнай частцы турніраў за перамогу змагаліся ўсе наймацнейшыя шашысты і шашысткі краіны.

Напрыклад, у мужчынскім турніры гулялі чатыры міжнародныя гросмайстры, і ўсе яны ўдзельнікі леташняга чэмпіянату свету па шашках-64 у Санкт-Пецярбургу. Пераможцам 12-ы раз стаў сталічны міжнародны гросмайстар Андрэй Валюк, які трэці раз запар заваяваў гэты тытул. У вырашальным мікра-матчы спартсмен дамогся ўпэўненай перамогі над дасведчаным майстрам спорту з Гомеля Раманам Протчанкам, набраўшы 19 ачкоў. Адзначым, што Андрэй Валюк таксама трохразовы чэмпіён свету і Еўропы.

Сярэбраны медаль заваяваў міжнародны гросмайстар з Ваўкавыска Ігар Міхальчанка, які набраў 18 ачкоў, трэцяе месца ў міжнароднага майстра з Гродна Сяргея Садоўскага, які набраў таксама 18 ачкоў.

Чэмпіёнкай Беларусі другі раз запар стала Вера Хвашчынская з Бабруйска, якая набрала 16 ачкоў і апярэдзіла сваіх сапернікаў на два балы. Сярэбраным і бронзавым прызёрамі сталі добра вядомыя сталічныя спартсменкі — Анастасія Барышава і Дар'я Федаровіч.

**Яўген САЛАНОВІЧ, майстар спорту.**

■ Грашовая палітыка

# ІНФЛЯЦЫЯ ПА ГОДЗЕ — НЕ БОЛЬШ ЗА 6 %

## Грашова-крэдытная палітыка сёлета будзе накіравана на забеспячэнне цэнавай і фінансавай стабільнасці



**Пра гэта ішла размова на пашыраным пасяджэнні праўлення Нацыянальнага банка, падчас якога разглядаліся вынікі выканання асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі за 2017 год і задачы банкаўскай сістэмы па іх рэалізацыі ў 2018 годзе, паведамляе прэс-служба Нацбанка.**

### ЗВР — не менш за 6 млрд долараў

«Грашова-крэдытная палітыка ў гэтым годзе захавае сваю пераемнасць. Дасягненне цэнавай стабільнасці будзе садзейнічаць устойліваму і збалансаванаму развіццю эканомікі». У Нацбанку адзначылі, што гадавая інфляцыя ў снежні 2017 года склала 4,6 %, што істотна ніжэй чаканага ўзроўню. Назіраецца паступовае аднаўленне дзелавой і крэдытнай актыўнасці, чаму спрыяла істотнае зніжэнне ўзроўню працэнтных ставак. Акрамя таго, летась забяспечаны значны рост золатавалютных рэзерваў, у тым ліку за кошт своечасовага рэфінансавання ўрадам сваіх валютных абавязацельстваў. Сфарміраваны запас дазволіць своечасова пагашаць золатавалютныя абавязацельствы сёлета, пры гэтым да канца года золатавалютныя рэзервы павінны складсі не менш за 6 млрд долараў.

Асноўнай мэтай грашова-крэдытнай палітыкі ў 2018 годзе з'яўляецца абмежаванне інфляцыі ў памеры не больш за 6 %. Вызначанае лімітавае значэнне росту спажывецкіх цэн некалькі вышэйшае за фактычны ўзровень мінулага года, што тлумачыцца захаваннем адносна высокіх інфляцыйных чаканняў у эканоміцы і аднаўленчай дынамікай унутранага попыту. Разам з тым устаноўлены на гэты год параметр па інфляцыі ўзгадняецца з сярэднетэрміновай мэтай па яе зніжэнні да 5 % па выніках 2020 года.

### Імгненныя плацяжы — з наступнага года

«Нацыянальным банкам будзе праводзіцца работа па стварэнні сэрвісу па імгненных плацяжах. Згаданы сэрвіс дазволіць удзельнікам плацежнага рынку ажыццяўляць плацяжы кругласутачна без выхадных і святочных дзён у рэжыме, максімальна набліжаным да рэальнага часу. Яго запуск плануецца ў 2019 годзе», — адзначылі ў прэс-службе.

У Нацбанку падкрэслілі, што для забеспячэння надзейнага функцыянавання плацежнай сістэмы ў гэтым годзе плануецца далейшае ўдасканаленне і падтрыманне ў актуальным стане нарматыўнай прававой базы, пашырэнне электроннага дакументаабароту паміж банкаўскай сістэмай і дзяржорганамі, развіццё праграмна-тэхнічнай інфраструктуры, а таксама зніжэнне рызык у плацежнай сістэме.

Працягнецца развіццё міжбанкаўскай сістэмы ідэнтыфікацыі шляхам пашырэння пераліку яе ўдзельнікаў, укаранення яе правядзення з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і інтэрнэту, выкарыстання банкамі біяметрычных даных кліентаў. Для ўрэгулявання адносін пры ажыццяўленні плацяжоў па паслугах нябанкаўскіх установ, дзейнасць якіх у цяперашні час не рэгулюецца банкаўскім заканадаўствам, распрацавана канцэпцыя Закона «Аб плацежных паслугах у Рэспубліцы Беларусь».

### Інвестыцыйны банкінг і рынак банкаўскіх аблігацый

Сёлета будзе развівацца фінансавы рынак шляхам удасканалення яго інструментаў і павышэння іх ліквіднасці, развіцця інфраструктуры. У прыярытэце — развіццё інвестыцыйнага банкінгу, рынку банкаўскіх аблігацый, укараненне механізмаў рэструктурызацыі, актывізацыя выкарыстання фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак, стварэнне ўмоў для дзейнасці банкаў у сферы калектыўных інвестыцый.

Працягнецца ўдасканаленне парадку выдачы банкаўскіх крэдытаў, у тым ліку з дапамогай выкарыстання банкамі паказчыкаў пазыковай нагрузкі. Будзе праводзіцца работа па развіцці сегмента некрэдытных фінансавых арганізацый. Прынятыя летась нарматыўныя прававыя акты дазволілі комплексна ўрэгуляваць праваадносіны ў сферы лізінгу жылых памяшканняў, павысіць фінансавую ўстойлівасць спажывецкіх кааператываў, знізіць рызыкі парушэння правоў спажыўцоў фінансавых паслуг.

### Лізінг інтэлектуальнай уласнасці

Таксама сёлета плануецца стварэнне прававой базы для лізінгу аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці і партнёрскага лізінгу, развіццё новых відаў мікрафінансавання з выкарыстанем фінансавых тэхналогій, функцыянавання самарэгулявальных арганізацый на базе профільных асацыяцый. Працягнецца фарміраванне комплекснай нарматыўнай прававой базы па стварэнні цэласнай сістэмы абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг.

### Адмяніць абавязковы продаж валютнай выручкі

У найбліжэйшай перспектыве, паведамілі ў Нацбанку, плануецца адмяніць неабходнасць атрымання фізічнымі асобамі дазволаў на адкрыццё рахункаў за мяжой, рэалізаваць пераход ад дазвольнага парадку правядзення асобных валютных аперацый руху капіталу да рэгістрацыйнага, цалкам адмяніць абавязковы продаж валютнай выручкі», — гаворыцца ў падрыхтаваным дакуменце.

Адначасова Нацыянальным банкам сумесна з урадам будзе працягнута работа па выключэнні выкарыстання замежнай валюты ў разліках на тэрыторыі Беларусі, а таксама пры фарміраванні цэн, ставак пошлін і іншых плацяжоў. У цяперашні час падрыхтаваны і праходзяць узгадненне адпаведныя прапановы па ўнясенні змяненняў у шэраг указаў Прэзідэнта, а таксама ў Грамадзянскі і Банкаўскі кодэксы.

Завяршэнне ключавых этапаў дэдаларызацыі мяркуецца да канца 2018 года. У Нацбанку падкрэслілі, што важнасць ажыццяўлення мер па ўдасканаленні валютнага заканадаўства абумоўлена перш за ўсё неабходнасцю зніцця існуючых бар'ераў і залішніх адміністрацыйных працэдур пры вядзенні бізнесу, захавання стабільнасці нацыянальнай валюты. У цэлым Нацбанк будзе рэалізоўваць узважаную манетарную палітыку, накіраваную на дасягненне сярэднетэрміновай мэты па інфляцыі і падтрыманне збалансаваных стымулаў эканамічнага росту.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Тэхналогіі

# ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР ВІРТУАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

## Чаму нам трэба павышаць узровень прававой культуры ў сферы IT



**Праваахоўнікі канстатуюць рост кіберзлачыннасці ў краіне. Колькасць злачынстваў у інфармацыйнай прасторы Беларусі за год павялічылася на 25,4 %. Прычым часцей зламыснікі «лавілі» сваіх ахвяр у інтэрнэце не дзякуючы высокаму прафесіяналізму, а праз бестурботнасць грамадзян. Хоць мы практычна без страт перажылі нашэсце вірусаў Petya і WannaCry летась, прадстаўнікі дзяржорганаў усё яшчэ занепакоеныя ўзроўнем прававой культуры беларусаў у сферы IT.**

### ІНТЭРНЭТ-БЕСТУРБОТНАСЦЬ

Як адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій крымінальнай міліцыі МУС Уладзімір ЗАЙЦАЎ**, колькасць выяўленых злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій летась у параўнанні з 2016 годам вырасла з 2471 да 3099. «Амаль тры чвэрці злачынстваў у кіберпрасторы звязаны з крадзяжамі шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі. Акрамя таго, на 20 % павялічылася колькасць выяўленых злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі», — дадаў Уладзімір Зайцаў. Калі разглядаць статыстыку дэталёва, то на 16 злачынстваў павялічылася колькасць фактаў непраправамернага завалодання камп'ютарнай інфармацыяй (да 29). Стала больш выпадкаў мадыфікацыі даных — з 13 у 2016 годзе, да 25 у 2017 годзе. Узрос і несанкцыянаваны доступ да камп'ютарных даных — з 258 да 462 злачынстваў. За мінулы год усталявалі 1052 датычных да інфармацыйнага бандытызму зламысьнікаў. Суму страт ад іх незаконных дзеянняў у віртуальнай прасторы ацанілі ў 3,2 млн рублёў.

Як адзначыў **следчы па асабліва важных справах галоўнага следчага ўпраўлення Следчага камітэта Аляксандр МАХНАЧ**, у беларусаў сёння нізкі ўзровень прававой культуры ў галіне інфармацыйных тэхналогій. «Часам даводзіцца ўпрошваць чалавека прыйсці на допыт і прызнаць сябе пацярпелым», — растлумачыў Аляксандр Махнач.

### ПАРАЗІТЫЧНЫ МАЙНІНГ

Аляксандр Махнач таксама расказаў, што ў сувязі з ажыятажам вакол біткойна камп'ютары беларусаў сталі часцей падвяргацца кібератакам, калі з дапамогай укаранення шкоднага кода на дэвайс у далейшым яго без вашага ведама выкарыстоўваюць як частку бот-сеткі для стварэння біткойнаў. «Неабходна кантраляваць свой інтэрнэт і выключэнне гаджэтаў, каб іх працэсары не выкарыстоўваліся зламыснікамі», — дадаў Аляксандр Махнач.

Калі на вашым камп'ютары ўжо ёсць праграма для схаванага майнінгу, які забірае вылічальныя магутнасці працэсараў, — ёсць два варыянты. «Калі грамадзянін настойвае на прыцягненні да адказнасці тых асоб, што заразілі яго камп'ютар, то ён павінен звярнуцца ў органы ўнутраных спраў. Пры гэтым ён павінен разумець, што яго тэхніка будзе ўзята для экспертызы на час яе правядзення. Без экспертызы гэта немагчыма. Камп'ютар вам пасля абавязкова вернуць», — растлумачыў Аляксандр Махнач.

Калі ж грамадзянін не хоча звяртацца ў праваахоўныя органы, то варта паспрабаваць пераўсталяваць аперацыйную сістэму на камп'ютары. «Не перашкодзіць раз на суткі выключаць мадэм на некалькі гадзін. Справа ў тым, што ў краіне дынамічныя IP-адрасы. Калі выключыць свой мадэм і атрымаць іншы IP-адрас, то шкодная праграма не зможа працаваць», — параіў Аляксандр Махнач.

### ЗАКОН ДЛЯ ПЕРСАНАЛЬНЫХ ДАНЫХ У РАСПРАЦОЎЦЫ

**Дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім ІПАТАЎ** адзначыў, што ў плане на 2018 год ёсць распрацоўка праекта закона аб персанальных даных. Такога сістэмнага і комплекснага дакумента ў Беларусі яшчэ няма. «Праведзена вельмі вялікая работа. У яго распрацоўцы прымала ўдзел вялікая колькасць дзяржорганаў. Каля 100 краін свету маюць такі закон. Нам неабходна было ўрэгуляваць гэтую сферу, у тым ліку зыходзячы з прадпісанняў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. Калі нашы кампаніі выходзяць за межы краіны і пачынаюць працаваць з персанальнымі данымі, то Беларусь могуць успрымаць як краіну з недастатковым узроўнем рэгулявання гэтага пытання», — растлумачыў Вадзім Іпатаў. Паводле яго слоў, ужо адпрацавана канцэпцыя дакумента і ўзгоднена на найвышэйшым узроўні. Неўзабаве пачнецца распрацоўка закона.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Грошы

# ДЗЕЙНІЧАЕ АМАЛЬ ШЭСЦЬ ТЫСЯЧ ГУЛЬНЯВЫХ АЎТАМАТАЎ...

**Ліцэнзіі на ажыццяўленне дзейнасці ў сферы гульнявога бізнесу выдадзены 107 юрыдычным асобам. У краіне функцыянуе 378 гульнявых устаноў, у тым ліку 26 казіно, 164 залы гульнявых аўтаматаў і 188 букмекерскіх кантор, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Міністэрства па падатках і зборах.**

Паводле аператыўнай інфармацыі, у нашай дзяржаве сёння зарэгістравана 6362 аб'екты падаткаабкладання падаткам на гульнявы бізнес, у тым ліку 178 гульнявых сталоў, 5978 гульнявых аўтаматаў, 206 кас букмекерскіх кантор. Падатковымі органамі за мінулы год праведзена 27 праверак юрыдычных асоб, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферы гульнявога бізнесу, па выніках якіх даналічана 345,1 тысячы рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Педагагічная майстэрня

# «УРОКІ СУЧАСНАСЦІ»: ЯК ЗАХАПІЦЬ ШКОЛЬНІКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРАЙ?



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**«Літаратура — гэта чалавеказнаўства, і менавіта яна фарміруе асобу, таму скарачаць праграму па такіх прадметах недапушчальна», — у гэтым перакананa Вольга ШВЕДАВА-ЮНІЦКАЯ, адна з пераможцаў конкурсу метадычных распрацовак «Урокі сучаснасці», які абвясціла для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры газета «Літаратура і мастацтва». Настаўніца, якая працуе ў Навасёлкаўскім вучэбна-педагагічным комплексе яслі-сад—сярэдняя школа, прапанавала ўрок пазакласнага чытання ў шостым класе па аповесці Андрэя Федарэнкі «Шчарбаты талер», з якім у выніку заняла другое месца. Метадычная распрацоўка настаўніцы прывабіла членаў журы сваёй крэатыўнасцю і інтэрактыўнасцю, разнастайнасцю формаў і педагагічных прыёмаў.**

Усяго на конкурс было даслана 75 работ. Найбольшую актыўнасць праявілі настаўнікі з Гродзенскай вобласці, якія даслалі 22 работы, або 30 % ад агульнай колькасці. Воляй лёсу ўсе тры прызавыя месцы таксама дасталіся педагогам з Гродзеншчыны. Узнагароджанне пераможцаў адбылося днямі ў канферэнц-зале выдавецкага дома «Звязда».

Трэцюю прэмію на конкурсе «Урокі сучаснасці» атрымала **Святлана КАМПАНЕЕЦ, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Радунскай сярэдняй школы Воранаўскага раёна**. Прапанаваныя ёю заняткі для вучняў 11 класа па тэме «Сучасная беларуская паэзія: творчасць Віктара Шніпа і Алеся Разанава» знаёмяць школьнікаў са складанай сучаснай паэзіяй, дапамагаюць выхоўваць адчуванне паэтычнага слова.

Як зазначыла падчас цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў **галоўны рэдактар «ЛіМа» Ларыса ЦІМОШЫК**, настаўніца даслала сваю работу літаральна за некалькі дзён да Новага года, хоць конкурс стартаваў у самы разгар летніх канікулаў. Увогуле найбольшая колькасць конкурсных работ паступіла ў апошнія дні адыходзячага года, а хтосьці ўвогуле ўскочыў у апошні вагон 31 снежня, між іншым, усе работы трэба было прачытаць, асэнсаваць і ўнікнуць у іх сутнасць.

— І вось сярод гэтага шквалу найцікавейшых распрацовак мы звярнулі ўвагу на ўрок па сучаснай паэзіі. Шніп і Разанаў — няпростыя паэты ў плане іх філасофскага асэнсавання. Таму хачу падзякаваць, што і гэта частка літаратуры — сучасная паэтычная творчасць — прыходзіць да нашых дзяцей. Усё ж такі ёсць настаўнікі, якія могуць навучыць школьнікаў разумець паэзію. Увогуле ўрокаў, прысвечаных паэзіі, на конкурс паступіла няшмат. І гэта быў той самы выпадак, які мы проста не маглі абмінуць увагай, — канстатавала Ларыса Цімошык.

А першае месца заняла метадычная распрацоўка **дзвюх настаўніц з гарадскога пасёлка Мір Алы БАКАЧ і Алены СМОЛЬСКАЙ** «Няўрымслівыя падарожнікі» (па творы Анатоля Бутэвіча «У гасцях у вечнасці», раздзел «Мір — цыганская сталіца»). Камісія конкурсу высока ацаніла складаную форму ўрока, выдатныя творчыя здольнасці канкурсантак, устаноўку на выхаванне талерантнасці, зварот да нацыянальных традыцый розных этнічных суполнасцяў шматнацыянальнай Беларусі.

Цікава, што Алена Смольская — вучаніца Алы Бакач. Больш за тое, апошняя выхоўвала дзяўчынку спачатку ў беларускамоўным дзіцячым садку, а потым, пачынаючы з пятага класа, выкладала ёй у школе родную мову. І вось яны ўжо дзесяць гадоў працуюць побач адна з адной. Алена Смольская прызнаецца: «Мяркую, што невыпадкова сустрэлася на маім шляху мая выхавальніца і мая настаўніца беларускай мовы Ала Іванаўна. Гэта сустрэча прадвызначыла прафесійны лёс. Мне пашчасціла вярнуцца пасля заканчэння філфака БДУ ў сваю родную школу і займацца любімай справай».

Як вядома, школьная праграма па беларускай літаратуры ў апошнія гады пераглядаецца. І не ўсе крокі яе распрацоўшчыкаў падтрымліваюцца настаўнікамі.

— Наколькі я разумею, у Саюзе пісьменнікаў Беларусі абмяркоўвалася пытанне наконт таго, каб напоўніць школьную праграму сучаснымі аўтарамі і творамі. Можа, і трэба гэта зрабіць, але як пры той колькасці гадзін, што адводзяцца на вывучэнне беларускай літаратуры, ахапіць усё? Мы, настаўнікі, — кансерватары і на ўсё новае цяжка пагаджаемся, але ў дыскусійных спрэчках да лагічнай ісціны, напэўна, усё ж такі прыйдзем, — разважае Святлана Кампанеец.

— У літаратуру прыходзіць вялікая колькасць маладых аўтараў, з імі трэба знаёміць школьнікаў, — упэўнена Вольга Шведава-Юніцкая. — Сучасныя дзеці, у сваёй большасці, не арыентаваныя на інтэлектуальную прозу. Вучням падабаюцца творы, звязаныя з нейкім жыццёвым матэрыялам, тое, што ім блізка, можа зачапіць іх за жывое. Тая літаратура, якую можна назваць беларускамоўнай белетрыстыкай, у самым добрым сэнсе гэтага слова, што лёгка ўспрымаецца, можа захапіць чытаннем нават не чытачоў, тая ж аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча, бо не сакрэт, што сучасныя дзеці чытаюць вельмі неахвотна.

А вось знікненне з абавязковай праграмы рамана Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» настаўнікі не падтрымліваюць, як і знікненне рамана Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні». Відавочна адно: **крытэрыі адбору мастацкіх твораў для іх уключэння ў вучэбную праграму па беларускай літаратуры і перспектывы развіцця гэтага прадмета ў школе трэба абавязкова абмяркоўваць з педагагічнай грамадскасцю.**

Дарэчы, у арганізатараў конкурсу «Урокі сучаснасці» ёсць задума падрыхтаваць PDF-зборнік з найлепшымі конкурснымі работамі. Ён стане добрай дапамогай для ўсіх настаўнікаў роднай мовы ў падрыхтоўцы цікавых і нестандартных урокаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Асобы

# СВОЙ ЖЫЦЦЁВЫ КОД,

## ці Калі прозвішча сугучнае са словам «школа»

**Размову з Наталляй ШОКАЛАЙ, настаўніцай рускай мовы і літаратуры сярэдняй школы ў горадзе Высокае Камянецкага раёна, смела можна разбіраць на цытаты — толькі паспявай запісваць! Я вельмі старалася занатаваць усю тую педагагічную і жыццёвую мудрасць, якою літаральна фантаніруе гэты педагог. Ці атрымалася? Меркаваць вам...**



Няма ў свеце, напэўна, ніводнай дзяўчынкі, якая ў школьныя гады не марыла б аб прафесіі настаўніка. Каб аднойчы ўвайсці ў клас з указкай і журналам, усміхнуцца свайм вучням і прамовіць запаветнае: «Добры дзень, дзеці!» Для Наталлі Мікалаеўны гэта мара здзейснілася напоўніцу.

Пасля Высокаўскай сярэдняй школы яна паступіла ў Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, прычым, абраная спецыяльнасць была даволі спецыфічная... Прынамсі, пра гэта і не толькі лепш раскажа яна сама.

«Я не магла зрабіць выбар паміж беларускай і рускай мовамі, якія любіла аднолькава, за што шчыра дзякую сваім цудоўным настаўнікам: Валянціне Мікалаеўне Фядковіч і Маіне Сяргееўне Доўгань. Пасля іх урокаў паступаць было лягчэй, а вобраз гэтых педагогаў стаў прыкладам на ўсё жыццё. Аднак, выбіраць было ўсё ж неабходна, і я... пайшла на кампраміс. Мая спецыяльнасць, якой сёння ўжо няма ў ВНУ, — «Беларуская і руская мова. Літаратура народаў свету». Такое цікавае спалучэнне».

Пасля ўніверсітэта па размеркаванні Наталля Шокала з задавальненнем вярнулася ў родную школу, дзе працуе вось ужо 20 гадоў — такі своеасаблівы юбілей. Прычым больш за дзесяць з іх яна выкладала беларускую мову, а потым перайшла да рускай.

Праца настаўніка грэе душу маёй гераіні. І імпануе, у першую чаргу, тым, што кожны яе дзень у школе цікавы і непаўторны. «Стараюся ўплятаць у мелодыю ўрока ноткі гумару. Заўсёды дазваляю вучням выказваць уласнае меркаванне, а ў адказ дзялюся сваім. Атрымліваецца дыялог».

Падчас урока Наталля Мікалаеўна часта карыстаецца сучаснымі тэхналогіямі, якія дапамагаюць зрабіць матэрыял цікавым і даходлівым. А вось мабільныя тэлефоны на гэтыя 45 хвілін для вучняў — пад забаронай. Цалкам станоўча настаўніца ставіцца да электронных кніг: калі вучню так больш зручна, калі ласка. Сама ж больш ахвотна возьме ў рукі традыцыйную кнігу.

Сярод вучняў настаўніцы — шмат пераможцаў алімпіяд і навукова-практычных канферэнцый. «Далучыць іх да ўдзелу не так і складана, угаворваць, на шчасце, не трэба. Многія імкнуцца самі, — распавядае мая гераіня. — А я, арыентуючыся на вопыт, адразу прыкмячаю: вось гэты хлопчык — паэт-пачатковец, гэты — артыстычны чытальнік, тая дзяўчынка валодае выдатнымі здольнасцямі да вывучэння мовы. Увогуле таленавітыя ўсе дзеці...»

Цікаўлюся, што Наталля Мікалаеўна робіць, калі нехта з выхаванцаў ну ніяк не жадае вучыцца, а яна тлумачыць, што нікога ніколі не прымушае, разумеючы, што лянівы, на першы погляд, школьнік можа быць проста фізікам па складзе розуму. Аднак неабходную базу па сваіх прадметах мая гераіня безумоўна дасць усім.

Калі ж дзённік школьніка стракаціць дрэннымі адзнакамі, то вінаватыя ў гэтым, на думку Наталлі Шокалы, і ён сам, і настаўнік, і бацькі. Калі гаварыць пра татаў і мам, то часам дзіцяці не хапае ад іх не тое што канкрэтнай дапамогі па фізіцы ці гісторыі, а падтрымкі маральнай. Увогуле ж, вучні сённяшнія не горшыя за колішніх, нават больш матываваныя. «Галоўнае, калі расказваю нешта на ўроку, бачу, што вочы іх не пустыя...»

У Высокаўскай СШ класы досыць вялікія па колькасці вучняў. І Наталлі Мікалаеўне, як яна прызнаецца, прасцей працаваць менавіта з такімі. «Калі ж справа датычыцца паглыбленага вывучэння прадмета, то лепш выкладаць групе з васьмі чалавек. Тады кожнага бачу».

Не магу абмінуць і змены, якія былі ўнесены ў школьную праграму не так даўно, у тым ліку па рускай мове і літаратуры. Наталля Шокала выступае супраць таго, што з яе выключаны твор Шэкспіра «Рамэа і Джульета». «На маю думку, ён менавіта для 14-гадовых, нават нягледзячы на няпростую мову аўтара. Маім дзецям, прынамсі, п'еса заўсёды падабалася. А вось санеты, якімі яе замянілі, больш падыходзяць 30-гадовым».

У Наталлі і яе мужа сёння падрастаюць двое дзетак: дачка Кацярынка вучыцца ў 5-м класе, сын Раман — у 2-м. Абое займаюцца ў музычнай школе па класах фартэпіяна і акардэона адпаведна. Сумяшчаць няпроста, але дазволу кінуць «музыкалку» дзеці не просяць, бо ў сям'і Шокалаў прынята так: пачаў справу — завяршы.

Калі пытаюся пра хобі, Наталля Мікалаеўна называе падарожжы. Дарога яе супакойвае... Куды ехаць, на чым, — без розніцы. Увогуле найлепшая вандроўка — спантанная. Мінулым летам, на канікулах, жанчына ездзіла з мужам, дзецьмі і сям'ёй брата на Нёман. З усмешкай успамінае, як а пятай гадзіне раніцы слухалі з Кацяй спевы першых птушак, выбраўшыся з палаткі. Зачараванне! Шокалы шмат дзе былі ў Беларусі, а самымі прыгожымі мясцінамі лічаць Палессе. Таксама мая гераіня вельмі любіць Полацк, называе яго СВАІМ горадам. «Адчуваю яго», — тлумачыць яна.

Акрамя таго, Наталля Мікалаеўна ахвотна вяжа дыванкі (мінулым летам паставіла абсалютны рэкорд — 12 за тры месяцы), вышывае крыжыкам карціны і ручнікі. Стварае звычайна нешта практычнае, не толькі для прыгажосці... «Прыемна, калі нехта носіць мае шкарпэткі, ходзіць па маіх дыванках. Сачу, у каго што прадзіравілася, і абнаўляю, раблю падарунак».

А яшчэ каля свайго дома Наталля Шокала высаджвае дрэвы. Яны растуць, цягнуцца галінкамі ў неба, як і вучні настаўніцы, чыё прозвішча, думаецца, невыпадкова такое сугучнае са словам «школа»...

**Настасся НАРЭЙКА**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества, принадлежащего УП «Киновидеопрокат» Мингорисполкома

| № Лота | Описание | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | 1. Машина холодильная фреоновая ХМ ФУУ-80 ІРЭ с инв. № 0102906/1; 2. Машина холодильная фреоновая ХМ ФУУ-80 ІРЭ с инв. № 0102906/2; 3. Машина холодильная фреоновая ХМ ФУУ-80 ІРЭ с инв. № 0102906/3. В состав холодильной машины входят: агрегат компрессорно-конденсаторный в комплекте с системой автоматического управления и электродвигателем 55 кВт/1500 об/мин, агрегат испарительно-регулирующий. Оборудование не эксплуатировалось более 20 лет, требует некоторого ремонта или замены отдельных частей | 22 546,69 | 2 000,00 |
| Лот № 2 | Трансформаторная подстанция КТПТАС-К/ВК-400/10/0.4. Не используется с 2009 года, требуется покраска | 6 339,97 | 600,00 |
| Лот № 3 | Сборно-разборный склад с инв. № 0100584. Каркас склада – профильный металл, обшивка – листовой металл, шиферная кровля, размер склада 9,2х8,2х4,5 м | 2 680,56 | 300,00 |
| Лот № 4 | Автомобиль ГАЗ 3110 101 кузов (рама) №XTH31100010453178, 2001 г. в. Тип ТС – легковой специальный седан. Особые отметки – фото-, кино-, видеообслуживание. Двигатель – бензин, 2 280 см³. Требует ремонта, возможно замены отдельных частей. Пробег по одометру на 01.12.2017 – 143 292 км | 923,42 | 100,00 |

**Местонахождение Лотов**: Лот №1 – г. Минск, пр-т Независимости, 73; Лоты №№ 2, 3 – г. Минск, ул. Папанина, 9; Лот № 4 – г. Минск, ул. Красноармейская, 26

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 5 (пяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона

Срок оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов): не более 10 (десяти) календарных дней после заключения договора купли-продажи.

Вывоз объектов (лоты 2, 4) и демонтаж и вывоз объектов (лоты 1, 3) производит Победитель аукциона (Претендент на покупку) за свой счет.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 21.02.2018 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Продавец**: УП «Киновидеопрокат» Мингорисполкома, 220030, г. Минск, ул. Красноармейская, 26, тел. 8 (017) 223-37-34.

**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11 пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего УП «Киновидеопрокат» Мингорисполкома, проводимом 21.02.2018. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений** 19.02.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов Кореник Андрей Сигизмундович, тел. 8 (017) 327-07-06, 8 (029) 619-73-54

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
02.02.2018 г.
Лихачевский В. В.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## ОБ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ ПЕРВОГО ВЫПУСКА
## Общества с ограниченной ответственностью «Хольцгрупп»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

Наименование Эмитента на русском языке:

полное — Общество с ограниченной ответственностью «Хольцгрупп»;

сокращенное — ООО «Хольцгрупп».

Наименование Эмитента на белорусском языке:

полное — Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Хольцгрупп»;

сокращенное —ТАА «Хольцгрупп».

2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail), официальный сайт: Республика Беларусь, 220033, г. Минск, пр-т, Партизанский, 23-2Н. Телефон/факс 8017 319-90-90 e-mail: sk@hlz.by, buh@hlz.by, официальный сайт: www.hlz.by (далее – сайт Эмитента).

3. Основными видами экономической деятельности Эмитента являются:

деятельность грузового автомобильного транспорта (грузоперевозки);

производство мебели;

оптовая и розничная торговля, кроме торговли автомобилями и мотоциклами.

4. Уставный фонд Эмитента составляет 500 (пятьсот) белорусских рублей.

5. Денежные средства, поступающие при размещении Облигаций Эмитента первого выпуска, будут зачисляться в соответствии с законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на расчетный счет Эмитента № BY51MMBN30120658900109330000 (в белорусских рублях) либо на счет Эмитента № BY49MMBN30120658900108400000 (в долларах США) в ОАО «Банк Москва-Минск», БИК MMBNBY22.

6. Депозитарием Эмитента является общество с ограниченной ответственностью «Промреестр» (далее – депозитарий), зарегистрированный Минским горисполкомом 29.06.2001 за № 101275094, код депозитария – D23. Место нахождения депозитария: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, д. 16, к. 608. Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-124-1123, выдано Министерством финансов Республики Беларусь.

7. Решение о первом выпуске Облигаций Эмитента принято Общим собранием участников Эмитента 27.11.2017 г. (Протокол № 14).

8. Облигации первого выпуска – именные, процентные, конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равные объем и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска облигаций независимо от времени приобретения (далее в настоящем документе совокупно именуемые «Облигации»).

Объем выпуска Облигаций – 300 000 (триста тысяч) долларов США.

Количество Облигаций – 3000 (три тысячи) штук.

Номинальная стоимость Облигации – 100 (сто) долларов США.

9. Эмитент осуществляет эмиссию необеспеченных Облигаций без учета положений, предусмотренных подпунктом 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» (далее – Указ № 277), в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа № 277.

В случае если объем настоящего выпуска Облигаций (общий объем выпусков необеспеченных облигаций Эмитента) превысит размер чистых активов Эмитента, Эмитент не позднее двух месяцев с даты, на которую им определялся размер чистых активов, представляет на сумму такого превышения обеспечение в соответствии с требованиями, предусмотренными в подпункте 1.7 пункта 1 Указа № 277, за исключением обеспечения исполнения обязательств страхованием ответственности за неисполнение (ненадлежащее исполнение) обязательств Эмитента Облигаций, либо принимает меры по погашению части выпуска Облигаций в размере разницы, возникшей между общим объемом выпусков необеспеченных облигаций и размером чистых активов Эмитента.

10. Размещение Облигаций осуществляется после опубликования в газете «Звязда», а также после размещения на Едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг, официальном сайте Эмитента и (или) официальном сайте организатора торговли – ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» Краткой информации об эмиссии Облигаций первого выпуска Эмитента, заверенной в установленном порядке Регистрирующим органом.

Дата начала размещения Облигаций – 22 января 2018 года. Дата окончания размещения Облигаций – 22 декабря 2019 года. Иная дата окончания периода размещения Облигаций может быть определена решением общего собрания участников Эмитента, принятым в порядке и в сроки, определенные законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах.

Срок размещения Облигаций может быть сокращен в случае полной реализации всего объема выпуска Облигаций.

11. Открытая продажа Облигаций осуществляется на организованном рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа) в соответствии с законодательством Республики Беларусь и локальными нормативно-правовыми актами Биржи.

Время проведения Открытой продажи Облигаций – в соответствии с регламентом торгов Биржи.

Расчеты при размещении Облигаций на организованном рынке производятся в соответствии с регламентом расчетов Биржи.

12. Срок обращения Облигаций – 730 календарных дней (с 22.01.2018 г. по 22.01.2020 г.). Для расчета срока обращения Облигаций день начала размещения и день начала погашения Облигаций считаются одним днем.

Обращение Облигаций осуществляется на организованном рынке в торговой системе Биржи в соответствии с законодательством Республики Беларусь и локальными нормативно-правовыми актами Биржи.

Для своевременного формирования депозитарием Эмитента реестра владельцев Облигаций обращение Облигаций прекращается за 3 (Три) рабочих дня до даты начала их погашения (досрочного погашения).

13. Дата начала погашения Облигаций – 22.01.2020 г.

Для целей погашения Облигаций депозитарий Эмитента формирует реестр владельцев Облигаций по состоянию на 17.01.2020 г.

В случае если дата формирования реестра владельцев Облигаций для целей погашения облигаций выпадает на нерабочий день, формирование реестра владельцев Облигаций осуществляется в последний рабочий день, предшествующий нерабочему дню.

14. По Облигациям установлен постоянный процентный доход (далее – доход), выплачиваемый периодически в течение срока обращения Облигаций по ставке 8 (восемь) процентов годовых.

Выплата дохода владельцам Облигаций производится:

в даты выплаты дохода;

на основании реестра владельцев Облигаций, сформированного Депозитарием для целей выплаты дохода;

путем перечисления Эмитентом в безналичном порядке суммы дохода на счета Владельцев Облигаций, открытые в банках Республики Беларусь в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь. В случае выплаты суммы дохода по Облигациям в белорусских рублях, выплата осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату выплаты процентного дохода по Облигации. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации по правилам математического округления с точностью до целой белорусской копейки.

Выплата суммы дохода по Облигациям может быть организована через Депозитарий Эмитента в соответствии с договором на депозитарное обслуживание Эмитента.

В случае отсутствия в реестре владельцев Облигаций данных о счетах Владельцев Облигаций, а также в случае, если реестр владельцев Облигаций содержит ошибочные банковские реквизиты, подлежащая выплате сумма резервируется на счете Эмитента и выплачивается после письменного обращения владельца Облигаций к Эмитенту.

15. В период обращения Облигаций и до даты начала их погашения Эмитент вправе принять решение о досрочном погашении данного выпуска Облигаций либо его части.

Кроме того, Эмитент осуществляет досрочное погашение части настоящего выпуска Облигаций в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь при невозможности предоставления обеспечения.

В случае принятия решения о досрочном погашении части данного выпуска Облигаций досрочное погашение осуществляется каждому владельцу Облигаций пропорционально количеству принадлежащих ему Облигаций. Расчет количества досрочно погашаемых Облигаций осуществляется с округлением до целого числа согласно правилам математического округления.

Досрочное погашение Облигаций осуществляется Эмитентом:

в отношении лиц, указанных в реестре владельцев Облигаций, который формируется депозитарием Эмитента за 3 (три) рабочих дня до установленной даты досрочного погашения Облигаций;

путем перечисления в безналичном порядке причитающейся суммы денежных средств в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь на счета владельцев Облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае выплаты денежных средств, причитающихся при досрочном погашении, в белорусских рублях, выплата осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату досрочного погашения Облигаций. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации с учетом правил математического округления с точностью до целой белорусской копейки.

Выплата денежных средств при досрочном погашении Облигаций может быть организована через Депозитарий Эмитента в соответствии с договором на депозитарное обслуживание Эмитента.

16. При погашении Облигаций владельцам Облигаций выплачивается номинальная стоимость Облигаций, а также доход за последний период начисления дохода (иной неполученный доход – при наличии).

Погашение Облигаций осуществляется Эмитентом:

в отношении лиц, указанных в реестре владельцев Облигаций, сформированном депозитарием Эмитента на дату, указанную в абзаце втором пункта 13 настоящего документа;

путем перечисления Эмитентом в безналичном порядке причитающейся суммы денежных средств в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь на счета владельцев Облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае выплаты денежных средств, причитающихся при погашении, в белорусских рублях выплата осуществляется по официальному курсу Национального Банка Республики Беларусь, установленному на дату начала погашения Облигаций. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации по правилам математического округления с точностью до целой белорусской копейки.

Выплата денежных средств при погашении Облигаций может быть организована через Депозитарий Эмитента в соответствии с договором на депозитарное обслуживание Эмитента.

17. В период обращения Облигаций Эмитент обязуется осуществлять приобретение Облигаций до даты начала их погашения с возможностью их последующего обращения (далее – досрочный выкуп Облигаций) по номинальной стоимости Облигаций в следующую дату: 22.01.2019 г. у любого их владельца. Если установленная дата выкупа выпадает на нерабочий день, выкуп Облигаций Эмитентом осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по текущей стоимости Облигаций.

18. В случае запрещения эмиссии Облигаций признания республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг, выпуска Облигаций недействительным, Эмитент:

возвращает владельцам Облигаций средства, полученные в оплату Облигаций, а также накопленный по этим Облигациям доход в месячный срок с даты признания выпуска Облигаций недействительным, запрещения эмиссии Облигаций. При этом все Облигации первого выпуска подлежат изъятию из обращения;

письменно уведомляет Регистрирующий орган о возврате указанных средств владельцам Облигаций в полном объеме.

21. Выпуск Облигаций зарегистрирован Республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг от 02.02.2018 года.

Государственный регистрационный номер первого выпуска Облигаций 5-200-02-3273.

22. Ознакомиться с Проспектом эмиссии (изменениями в Проспект эмиссии – при наличии) можно визуально по адресу нахождения Эмитента: Республика Беларусь, 220033, г. Минск, пр-т Партизанский, 23-2Н с 10.00 до 16.00 в будние дни, на сайте Эмитента либо на сайте Организатора выпуска ООО «Ласерта» www.lacerta.by

Директор ООО «Хольцгрупп» Курс С. Ф.

Главный бухгалтер ООО «Хольцгрупп» Павловская Е. В.

УНП 190679143

---

Утерянную печать и свидетельство о государственной регистрации **ООО «Гамма Инк»** (УНП 191684140) **считать недействительными**.

---

**Открытое акционерное общество «ПРОМЭЛЕКТРОМОНТАЖ»**, место нахождения: 220033, г. Минск, ул. Аранская, д. 13, каб. 15, раскрывает информацию о том, что внеочередным общим собранием акционеров ОАО «ПРОМЭЛЕКТРОМОНТАЖ», **состоявшимся 05.02.2018 г.** (протокол № 1), принято решение о принятии в счет погашения долга ООО «Мивит» по исполнительному документу имущества, которое не было реализовано в рамках исполнительного производства: простые (обыкновенные) акции собственного выпуска в количестве 1148 (одна тысяча сто сорок восемь) штук для последующего аннулирования в целях сокращения их общего количества и уменьшения уставного фонда Общества.

Принятие простых (обыкновенных) акций в счет погашения долга ООО «Мивит» будет осуществляться по цене 3 рубля 36 копеек за одну простую (обыкновенную) акцию в срок **не позднее 28.02.2018 г.** на основании постановления о переводе арестованных бездокументарных ценных бумаг, вынесенного судебным исполнителем.

**Управляющий** **Ю. Г. Крылов**

УНП 100088916

---

## Извещение о проведении 26 февраля 2018 года повторных торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, местонахождение, продаваемого имущества)** | Изолированное помещение транспортного назначения – гараж с инв. № 500D-11638, площадь 45,8 кв. м, расположенный по адресу: г.Минск, ул. Инженерная, 36/8-22 |
| **Начальная цена** | 8 748,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 874,80 бел. руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 26 февраля 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 07.02.2018 по 21.02.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».

# ДАЛІКАТНАЯ ТЭМА

## Аб чым яшчэ трэба клапаціцца мужчынам

**Пра далікатныя мужчынскія праблемы, якія прымушаюць уставаць па некалькі разоў за ноч, пра рак прастаты, агрэсіўны і той, з якім можна пражыць доўгае жыццё, а таксама пра самыя распаўсюджаныя захворванні — з імі сутыкаецца 80 % моцнай паловы ў сталым узросце, мы пагутарылі з урачом-уролагам мінскага раённага ўралагічнага цэнтра № 2 Арцёмам БАРАВІКОМ.**

***— З якімі захворваннямі часцей за ўсё да вас звяртаюцца мужчыны?***

— На першым месцы распаўсюджанае ўзроставае захворванне — адэнома прастаты, як яе называюць згодна са старой класіфікацыяй, або дабраякасная гіперплазія прастаты, як прынята гаварыць цяпер. Пасля 60 гадоў каля 80 % мужчын з ім сутыкаюцца, яно праяўляецца павелічэннем гэтай залозы ў памерах. Прастата знаходзіцца пад мачавым пузыром і, павялічваючыся ў памерах, «ахоплівае» мочаспускальны канал, такім чынам адбываецца яго сцісканне. Адсюль і сімптомы, звязаныя з парушэннем мочаспускання. Яны праяўляюцца цяжкасцю пры мочаспусканні, частым, часам нястрымным позывам да мочаспускання з аслабленнем струменя мачы. Могуць з'яўляцца боль і пачуццё няпоўнага апаражнення мачавога пузыра. Гэта асноўныя сімптомы. Частае мочаспусканне, асабліва начное, калі ўставаць прыходзіцца па 5-7 разоў, прымушае хворага біць трывогу і звяртацца да ўрача.

А вось яшчэ з адным распаўсюджаным захворваннем, ракам прастаты, пацыенты не заўсёды своечасова прыходзяць да доктара. Зараз нельга дакладна сказаць, чаму ў аднаго хворага дабраякасная гіперплазія, а ў другога злаякасныя новаўтварэнні, наконт гэтага няма навукова доказаных фактаў. Ракавая пухліна ніякіх сімптомаў не выклікае, натуральна, клеткі разрастаюцца. Часам пацыент звяртаецца, калі ўжо ёсць метастазы — часцей за ўсё ў косці, у лёгкія ці іншыя ўнутраныя органы, — і скардзіцца на косныя ці рэйматычныя болі, радыкуліт. А выяўляецца рак прастаты. Тут важныя своечасовая дыягностыка і штогадовы візіт да ўролага для прафілактычнага агляду ўсіх



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

мужчын пасля 50 гадоў. Урач прызначае тры медыцынскія мерапрыемствы. Першае — рэктальнае даследаванне прастаты, якое дазваляе ацаніць яе памер, выявіць пухліну, бо яна часцей за ўсё паражае перыферычную частку залозы і вызначаецца ў выглядзе зацвярдзення. Другое — аналіз крыві з вены на прастатспецыфічны антыген (ПСА). Гэта маркёр ранніх злаякасных працэсаў у прастаце. Калі ён павышаны, урач можа западозрыць рак і прызначае біяпсію прастаты. Трэцяе — УГД прастаты і мачавога пузыра. Яно дазваляе больш дакладна вызначыць памер прастаты і аб'ём рэшткавай мачы.

***— Ці можна пазбегнуць гэтых захворванняў?***

— Важнае значэнне маюць лад жыцця і харчаванне. Даказана, што рост прастаты стымулюе гармон: тэстастэрон ператвараецца ў дэгідратэстастэрон, які і ўплывае на дзяленне клетак залозы. Ёсць шэраг прадуктаў расліннага паходжання, якія змяшчаюць фітаэкстрагены, гэта аналагі жаночых палавых гармонаў. Яны звязваюцца з рэцэптарамі прастаты і блакуюць іх ад уздзеяння тэстастэрону. Гэтыя рэчывы ёсць у агародніне і садавіне, соі, злаках, віне. Таму бакал чырвонага віна ў тыдзень не супрацьпаказана.

***— А піва?***

— Яно таксама змяшчае фітаэстрагены, але ў вялікай колькасці. Іх лішак можа стымуляваць гарманальныя змены ў арганізме мужчын. Таму тут важна не перабраць.

***— Яшчэ адно распаўсюджанае захворванне — прастатыт...***

— Гэта запаленчы працэс у тканках прастаты. Ён можа развівацца ў любым узросце. Прастатыт бывае трох відаў. Першы — бактэрыяльны, яго выклікаюць мікраарганізмы. Другі — застойны, звязаны з ацёкам прастаты ў выніку застойных з'яў — рэдкага палавога жыцця ці, наадварот, празмернага па прычыне ацёчнасці, пашкоджання з-за частай стымуляцыі. Трэці — праз захворванне суседніх з прастатай органаў, такіх як гемарой, ацёк прамой кішкі. Прастатыт праяўляецца таксама цяжкасцю і болем падчас мочаспускання, дэфекацыі, пачуццём цяжару ў нізе жывата, пражэнасці. Часам боль можа пераходзіць у пахвіну. Калі пацыент адзначае ў сябе такія сімптомы, то ён звяртаецца да ўрача. Тут прызначаецца антыбактэрыяльная тэрапія, калі гэта інфекцыя, і дадатковае супрацьзапаленчае лячэнне. Таксама важная прафілактыка. Найперш нармалізацыя палавога жыцця: трэба памятаць, што як зашмат, так і мала — дрэнна.

***— Тады з медыцынскага пункту гледжання нармальна — гэта колькі?***

— У спецыялізаванай літаратуры такіх рэкамендацый няма. У кожнага свая патрэба. Камусьці, каб пазбегнуць застойных з'яў, трэба раз на дзень, камусьці і раз на тыдзень. Мы рэкамендуем два разы на тыдзень для любога ўзросту. Калі я заўважаю, што пацыенты вядуць палавое жыццё ў 60, у 80 гадоў, гэта станоўчы момант, як уролаг, я гэта вітаю. Таксама важна не дапускаць пераахаладжвання прастаты. Яно зніжае мясцовы імунітэт, садзейнічае актывізацыі інфекцыі.

***— Наколькі, дарэчы, небяспечныя для прастаты такія працэдуры, як зімовае акунанне ў палонку?***

— Калі мужчына загартоўваўся на працягу года, арганізм адаптаваўся да такіх працэдур, то пачувае сябе добра. А калі чалавек схільны да прастудных захворванняў і не можа пераносіць такія нагрузкі, то зразумела, што гэта небяспечна, бо выклікае развіццё інфекцый у прастаце, яе запаленне. У такім выпадку можа развівацца востры прастатыт з павышэннем тэмпературы і развіццём гнойных працэсаў у залозе, што патрабуе лячэння ў стацыянарных умовах. Але пацыенты, якія маюць хранічныя праблемы з прастатай, як правіла, экстрэмальных заняткаў пазбягаюць. І ведаюць, што, пасядзеўшы нават у транспарце на халодным сядзенні, правакуюць абвастрэнні. А для мужчын, якія ніколі з такім захворваннем не сутыкаліся, гэтыя працэдуры сапраўды могуць скончыцца вострым запаленнем. З далейшым пераходам пры няправільным лячэнні ў хранічныя працэсы.

***— Якія яшчэ меры прафілактыкі трэба выконваць, каб пазбегнуць прастатыту?***

— Пажадана насіць бялізну з натуральных валокнаў, ні ў якім разе не сінтэтыку. Мець штодзень умераныя фізічныя нагрузкі. Мы рэкамендуем комплекс спецыяльных практыкаванняў. Калі маладыя мужчыны могуць і звычайна займаюцца ў спартыўнай зале, то сталыя павінны выконваць больш лёгкія практыкаванні, скіраваныя на павышэнне кровазабеспячэння органаў малога таза. На прыёме ўролага, як правіла, можна атрымаць памяткі з такімі практыкаваннямі.

> **«Пацыенты, якія маюць хранічныя праблемы з прастатай, як правіла, экстрэмальных заняткаў пазбягаюць. І ведаюць, што, пасядзеўшы нават у транспарце на халодным сядзенні, правакуюць абвастрэнні».**

***— Раней з-за мужчынскіх хвароб часта прыходзілася рабіць аперацыі, а цяпер?***

— Так, гадоў 20 таму з павелічэннем прастаты абавязкова рабілася аперацыя. Зараз сучаснае медыкаментознае лячэнне дазваляе значна зменшыць сімптомы: аблегчыць мочаспусканне, зменшыць яго частату, палепшыць апаражненне мачавога пузыра і такім чынам пазбегнуць аперацыі. Хірургічнае ўмяшанне прымяняецца на больш позніх стадыях, калі медыкаментознае лячэнне не дапамагае. Але мы імкнёмся адкласці яго на больш позні тэрмін.

***— Калі з'явілася пухліна прастаты, зменшыць яе з дапамогай прэпаратаў не атрымаецца?***

— Мы можам толькі замарудзіць яе рост, уплываючы на гарманальны ланцужок. Пачынаем звычайна з раслінных прэпаратаў, якія ўздзейнічаюць на фермент, яны маюць прафілактычнае значэнне. І іх рэкамендуем пацыенту на пershай стадыі гіперплазіі. Такія прэпараты выпрацоўваюцца на аснове пальмы паўзучай, афрыканскай слівы. Семя гарбуза добрае для прафілактыкі — кожны дзень трэба ўжываць па жменьцы. Там змяшчаюцца раслінныя бялкі, якія замаруджваюць механізмы гіперплазіі падчас пастаяннага прыёму. Калі залоза расце марудна, захоўваецца прыкладна на адным узроўні, у пацыента няма выражаных сімптомаў, мы працягваем прафілактыку і назіранне. Важна штогод прыходзіць на абследаванне да ўролага.

***— Лічыцца, што рак прастаты найбольш лёгка паддаецца лячэнню, пацыент можа пражыць з ім доўгае жыццё і памерці ад іншых хвароб. Гэта сапраўды так?***

— Рак прастаты таксама гармянальна залежнае захворванне. У пажылых пацыентаў 70—80 гадоў ракавыя клеткі, як правіла, знаходзяцца ў спячым стане, марудна растуць. А вось у маладых — злаякаснае новаўтварэнне можа ў 40 гадоў і нават раней з'явіцца — амаль заўсёды гэта агрэсіўны рак. Ён мае добрую стымуляцыю гармонам, вельмі хутка расце. Тут трэба пачынаць дзейнічаць як мага раней і хутчэй. У пажылых пацыентаў аперацыі па выдаленні прастаты разам з пухлінай, як правіла, не прымяняюцца, асабліва калі рак распаўсюджаны, выходзіць за межы прастаты або паражае некалькі яе долей. Часта пацыенты ад такога раку не гінуць. Прагноз звычайна такі, што хвароба істотна распаўсюдзіцца праз 30 гадоў. І калі на гэты час хвораму 80, то анколагі рэкамендуюць гарманальнае лячэнне. Гэта або выдаленне мужчынскіх палавых залоз, дзякуючы чаму знікае стымуляцыя тэстастэронам, або медыкаментозны андрагенны блок, калі спецыяльнымі прэпаратамі падаўляецца актыўнасць мужчынскіх палавых гармонаў. Апошняе больш цяжка пераносіцца пацыентам, бо трэба пастаянна прымаць таблеткі, а яны маюць пабочныя эфекты. Але гэта дапамагае пры адмене зноў аднавіць гарманальны фон. Нямногія вырашаюцца на выдаленне яечак, для пацыентаў гэта псіхалагічна складаны момант. Тут з кожным вядзецца гутарка і індывідуальна вырашаецца мэтазгоднасць таго ці іншага спосабу лячэння ■

# Што і ў якім узросце абследаваць, каб пазбегнуць раку

**Як вядома, чым раней удаецца выявіць анкалагічнае захворванне, тым больш шанцаў у хворага цалкам вылечыцца.**

Паводле інфармацыі **намесніка дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Сяргея КРАСНАГА**, калі рак выяўляецца на першай ці другой стадыі, 80 % хворых цалкам папраўляюцца. А вось на трэцяй стадыі так званы пяцігадовы парог выжывання пераадольвае ўсяго палова пацыентаў. З 4-й стадыяй, як вядома, пакуль можна весці размову толькі пра падаўжэнне жыцця і медыкаментознае аблягчэнне пакут хворага.

Каб своечасова выявіць самыя распаўсюджаныя злаякасныя новаўтварэнні, у Беларусі з 2007 года пачалі даследаваць, а з 2016 года шырока ўкаранілі скрынінгавыя праграмы. Яны дазваляюць выявіць рак некалькіх лакалізацый: малочнай залозы, прастаты, тоўстай кішкі і шыйкі маткі. Прычым зрабіць гэта на самых ранніх стадыях, калі пацыент не адчувае ніякіх сімптомаў. Для гэтага абследуюцца ўсе здаровыя людзі пэўных узроставых катэгорый. І ўжо летась такая праграма дала свае вынікі: рак выяўлены ў 1,5 тысячы чалавек. У большасці — на першай-другой стадыі, што дазваляе даваць аптымістычныя прагнозы для такіх хворых. Сёння, напрыклад, каля 40 % мужчын ахоплены скрынінгам раку прастаты.

— Кожны мужчына ва ўзросце 50—65 гадоў раз на два гады павінен здаваць аналіз крыві на ПСА (прастатспецыфічны антыген), — расказвае Сяргей Красны. — З часам плануем распаўсюдзіць такое абследаванне на больш маладых мужчын — з 45 гадоў.

Праграма скрынінгу раку малочнай залозы ахоплівае пакуль 20 % жанчын. Гэта рэнтген-мамаграфія малочных залоз, і яе трэба праходзіць ва ўзросце ад 50 да 70 гадоў. Абследаванне дазваляе выявіць рак на нулявой і першай стадыях і з'яўляецца найбольш інфарматыўным у адрозненне ад астатніх метадаў.

Скрынінг каларэктальнага раку найбольш складаны і пакуль сустракае супраціўленне ў насельніцтва.

— Праграмай, якая прадугледжвае аналіз калу на выяўленне схаванай крыві, пакуль ахоплена 2,5 % людзей. Такі аналіз трэба рабіць раз на два гады ва ўзросце ад 50 да 70 гадоў. Пры наяўнасці схаванай крыві пацыенту прызначаюць каланаскапію пад агульным наркозам, што дае магчымасць адначасова выдаліць паліпы, калі тыя ёсць, эндаскапічным метадам, — кажа Сяргей Красны. — Гэта дазволіць папярэдзіць 70—80 % раку тоўстай кішкі. Нягледзячы на тое, што пацыенты не вельмі вітаюць такое абследаванне, раю ўсім: калі ўрач прапануе яго зрабіць, ні ў якім разе не адмаўляйцеся.

Скрынінг раку шыйкі маткі вядзецца ў нашай краіне з 70-х гадоў мінулага стагоддзя, але зараз мяняюцца тэхналогіі яго выяўлення — адбываецца пераход на вадкасную цыталогію. Абсталяванне ўжо з'явілася ва ўсіх абласных цэнтрах. Для жанчын (а яго рэкамендуюць праходзіць ва ўзросце ад 30 да 60 гадоў) такі пераход будзе незаўважны — гэта, як і раней, мазок. А вось для спецыялістаў патрэбна дадатковае навучанне, якое яны і прайшлі.

На найбліжэйшы час у нашай краіне запланаваныя даследаванні па стварэнні праграм скрынінгу раку лёгкага і страўніка. Яны зоймуць некалькі гадоў. Скрынінг раку лёгкага скіраваны на мужчын, пачынаючы з 50-гадовага ўзросту, якія маюць 15-гадовы стаж курэння.

— Рак лёгкага вельмі агрэсіўны, — кажа Сяргей Красны. — Пухліна імкліва прагрэсуе ўжо на першай стадыі. Яе дакладна можна выявіць з дапамогай нізкадазіраванай камп'ютарнай тамаграфіі. Але гэта дарагое абсталяванне. Што датычыцца раку страўніка, то тут пацыенты павінны здаваць аналіз крыві на выяўленне бактэрыі хелікабактар пілары. Пасля па паказаннях прызначаецца гастраскапія з біяпсіяй. Такі метад паказаў сваю эфектыўнасць у Японіі, а вось у ЗША не прыжыўся. Таму будзем весці даследаванні ў нас і вызначаць эфектыўнасць.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# САКРЭТЫ

**Аб літаратурным і выдавецкім жыцці за круглым сталом разважалі начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Алена ПАЎЛАВА, дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір АНДРЫЕВІЧ, дырэктар выдавецтва «Беларусь» Сяргей ПЕШЫН, начальнік гандлёвага аддзела ААТ «Белкніга» Святлана ГУК і дырэктар «Акадэмічнай кнігі» Вольга ГЛУХОЎСКАЯ.**




**«ЗВЯЗДА»:**

***— Наша гутарка адбываецца напярэдадні XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Як думаеце, наколькі падобныя мерапрыемствы спрыяюць папулярызацыі кніг? Можа быць, іх наведваюць кнігалюбы, якія і без таго цікавяцца літаратурай? Менавіта на іх скіравана праца стэндаў або ўдаецца завабіць чытача, далёкага ад літаратурных колаў?***

**Уладзімір Андрыевіч:**

— Выстаўка — гэта прэзентацыя кнігі. І любую форму такога прадстаўлення я лічу станоўчай. Тым больш можна арыентавацца на лічбы — на выстаўцы 2017 года мы прадалі ў два разы больш кніг, чым на папярэдняй — і гэта шмат пра што сведчыць. Да таго ж цікава паглядзець, якія кнігі прадстаўляюць нашы суседзі з іншых краін. У той жа час мы маем магчымасць паказаць ім беларускія кнігі — і такім чынам нашы выданні, магчыма, могуць трапіць за мяжу. Падчас такіх выставак праводзяцца літаратурныя сустрэчы і сімпозіумы, ладзяцца выдавецкія пляцоўкі, дзе кнігавыдаўцы і кнігагандляры сустракаюцца, дыскутуюць і выпрацоўваюць стратэгіі.

Дарэчы, мяне вельмі ўразілі кніжныя выстаўкі ў Вільнюсе і Бялградзе: гэта былі падзеі для ўсяго горада, усёй краіны — паўсюль вялікія плакаты, білборды з заклікамі чытаць. На іх прыходзілі і прыязджалі цэлымі класамі, школамі. Мабыць, на такія мерапрыемствы, каб зацікавіць пакаленне, якое падрастае, варта запрашаць і нашых школьнікаў. Няхай хаця б мінскія дзеці завіталі на кніжны кірмаш, хоць і за кошт урокаў па літаратуры ці мове.

**Алена Паўлава:**

— Варта дадаць, што кніжныя выстаўкі за мяжой — у асноўным платныя. І білеты каштуюць досыць дорага. На нашу Мінскую міжнародную кніжную выстаўку ўваход бясплатны. Мы запрашаем усіх мінчан і гасцей сталіцы далучыцца да яе. Паверце, будзе вельмі цікава. Зараз рыхтуецца праграма, якая прадугледжвае мноства мерапрыемстваў, прэзентацый, сустрэч з аўтарамі.

Сёлета ганаровым госцем будзе Сербія, а цэнтральным экспанентам — Казахстан. Таксама чакаецца шырокі ўдзел кнігавыдаўцоў з Расіі, Германіі, Вялікабрытаніі, ЗША, Кітая з цікавай прэзентацыйнай праграмай і прадстаўленнем новых кніг.

Стала ўжо традыцыйным праводзіць у рамках выстаўкі міжнародны сімпозіум літаратараў "Пісьменнік і час" (сёлета ён будзе чацвёртым па ліку) з запрашэннем знакавых пісьменнікаў блізкага і далёкага замежжа. Сваю згоду на ўдзел у сёлетнім сімпозіуме ўжо пацвердзілі пісьменнікі з Расіі, Украіны, Сербіі, Казахстана, Кітая, Англіі, Чэхіі, Літвы, Арменіі, Кыргызстана, Малдовы, Пакістана, Польшчы, Румыніі, Славакіі, Францыі, Латвіі. Падчас сімпозіума пройдзе семінар літаратараў-перакладчыкаў, арганізаваны Міністэрствам інфармацыі ва ўзаемадзеянні з Міжнародным фондам гуманітарнага супрацоўніцтва краін-удзельніц СНД у рамках рэалізацыі міжнароднага гуманітарнага праекта «Мінская ініцыятыва», а таксама літаратурная дыскусія маладых пісьменнікаў, арганізаваная пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.

На выстаўцы адбудзецца ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу маладых літаратараў «Першацвет», арыентаванага на пошук, раскрыццё і падтрымку маладых таленавітых аўтараў, які адкрывае новыя імёны ў літаратуры. Творчасці маладых аўтараў будзе прысвечана і прэзентацыя ў рамках выстаўкі зборніка «Першацвет», выпушчанага па выніках конкурсу, а таксама кнігі Станіславы Умец «Сэрца Сакрэ: фэнтэзі», якая адкрыла новую серыю выдавецтва «Мастацкая літаратура» «Час XXI».

На нацыянальным стэндзе Беларусі ў дні работы выстаўкі будуць арганізаваны шматлікія сустрэчы з аўтарамі, выдаўцамі, мастакамі, прэзентацыі новых кніг, круглыя сталы, аўтограф-сесіі, іншыя мерапрыемствы. Тут жа адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў 57-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі». Будзе таксама арганізаваны шырокі продаж новых кніг беларускіх кнігавыдаўцоў. Так што, мне здаецца, кожны, хто завітае на выстаўку, знойдзе для сябе штосьці цікавае і карыснае.

## КАБ ГОДНА ПРАДСТАВІЦЬ ТВОР

**«ЗВЯЗДА»:**

***— Мы жывём у XXI стагоддзі. Кнізе даводзіцца канкурыраваць з інтэрнэтам, тэлебачаннем, тэатрам. Відавочна, што выпускаць кніжную прадукцыю ў такі час не вельмі проста. Ці ёсць сёння дзейсныя сродкі папулярызацыі кніг?***

**Святлана Гук:**

— Практыкуюцца розныя спосабы прасоўвання. Гэта сустрэчы, прэзентацыі, аўтограф-сесіі, рэклама ў сацыяльных сетках. Таксама рэклама па тэлебачанні і на мясцовым радыё. Асабліва ў невялікіх гарадах рэкламай на радыё карыстаюцца надзвычай часта. У апошні час кнігавыдаўцоў пачалі часцей запрашаць на тэлебачанне, да ўдзелу ў ток-шоу.

**Вольга Глухоўская:**

— Маркетынг кніжных выданняў праз сацыяльныя сеткі — вельмі дзейсны спосаб рэкламы. Але для таго, каб гэта рабіць, у ідэале патрэбен асобны спецыяліст — які б «жыў» у сацыяльных сетках, збіраў «лайкі», падпісчыкаў, чытаў інфармацыю і вёў перапіску. Калі хтосьці не будзе гэтага рабіць на пастаяннай аснове, працэс спыніцца.


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
Алена ПАЎЛАВА.


Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.


Сяргей ПЕШЫН.

Вельмі эфектыўнай рэкламай з'яўляецца размяшчэнне інфармацыі пра новыя выданні на вітрынах двух крам «Акадэмкніга». Вітрыны выдаўцам мы выдзяляем бясплатна.

**«ЗВЯЗДА»:**

***— Хто займаецца ажыццяўленнем пералічаных метадаў? Гэта аўтар, выдавец ці кнігагандляр?***

**Алена Паўлава:**

— Павінны займацца ўсе — і аўтар, і выдавецтва, і кніжны гандаль, і бібліятэкі. Павінны быць задзейнічаны прэса і тэлебачанне. Толькі тады пра кнігу даведаюцца, ёю зацікавяцца і, магчыма, купяць.

**Святлана Гук:**

— Ініцыятыва можа ісці ад любога ўдзельніка гэтага працэсу, а часцей усё адбываецца комплексна. Ёсць, напрыклад, вельмі актыўныя аўтары. Нават выдаючы кнігу за ўласныя грошы, яны гатовы яе рэкламаваць, сустракацца з чытачамі. У Белкнізе ёсць аддзел, які таксама займаецца правядзеннем пэўных сустрэч з аўтарамі, гатовымі ісці на кантакт (але не кожны творца згодны прадстаўляць свой твор).

**Алена Паўлава:**

— Прытым я не стала б спадзявацца толькі на дзяржаву, якая можа знізіць стаўку ПДВ на кнігі. Паказальны вопыт ААТ «Белкніга», якое з мэтай зніжэння цаны на сацыяльна значную кнігу, выдадзеную ў дзяржаўных выдавецтвах, прымяняе гандлёвую надбаўку ў памеры ўсяго пяць працэнтаў.

**Вольга Глухоўская:**

— Рознічныя сеткі не могуць павышаць кошты, бо многія выданні — і так дарагое задавальненне. Расходы на рэкламу павінны несці ў першую чаргу выдаўцы. У нас сёння адсутнічае сістэма інфармавання чытачоў пра тое, што выйшла тая ці іншая кніга. Калі дзесьці і змяшчаецца такая навіна — часцей за ўсё гэта невялікія выданні, якія не ствараць вялікага ажыятажу вакол кніжнага рынку. Калі рабіць рэкламу на нейкіх буйных парталах (я ўжо не кажу пра тэлебачанне), то гэта зусім эканамічна немэтазгодна — вельмі дорага. Нават у Германіі, дзе выдаюць нашмат больш кніг, бо там жыве і больш насельніцтва, не робяць такіх публічных абвестак. Там пакупнікі, як правіла, прывязаны да нейкай канкрэтнай крамы — іх часцей за ўсё інфармуюць з дапамогай смс-рассылак. А арганізоўваць пэўныя мерапрыемствы сапраўды лепш усім разам.

**Уладзімір Андрыевіч:**

— Не зусім пагаджуся. Мне падаецца, што ў нашых заходніх суседзяў ужо праходзіць бум інтэрнэту, калі можна так сказаць, новы сучасны носьбіт інфармацыі ўсё больш выкарыстоўваецца не столькі як гульня ці прылада для баўлення вольнага часу, колькі як сродак для самаўдасканалення і для наладжвання больш эфектыўнай працы. Людзі зноў сталі больш цікавіцца кнігай, больш чытаць, а не сёрфінгаваць па інфармацыі ў інтэрнэце, так, як робяць пакуль, на жаль, многія з нас. Між іншым, гэты працэс адбываецца і ў нашым грамадстве. На мінулагоднім Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы мне надзвычай цёпла рабілася на сэрцы, калі я бачыў бацькоў, якія разам з дзеткамі ішлі на кніжны кірмаш. Мяркую, што так будзе і сёлета. Бо, напэўна ж, кнігавыдаўцы прадставілі і прадставяць тыя выданні, якімі цікавяцца людзі. Бо ў кожным разе кніга застанецца — ці то на смартфоне, ці на якім-небудзь іншым носьбіце. Не варта ўсю адказнасць па папулярызацыі кнігі перакладваць на выдавецтвы. Бо кнігавыдаўцы павінны і аўтара цікавага знайсці, і выдаць кнігу добрай якасці пры невялікім кошце (гэта ў савецкія часы выданне асобніка абыходзілася танна, бо былі надзвычай вялікія тыражы). Таму праца па прасоўванні выдання павінна быць комплекснай. Вельмі важна і патрэбна ў грамадстве падтрымліваць дух чытання, імкнення праз гэта да ведаў і самаадукацыі. Кніга — гэта сацыяльны прадукт, прапаноўваць яго павінны, безумоўна, кнігавыдаўцы, а дапамагаць прасоўванні і сродкі масавай інфармацыі. Людзі, асабліва ў глыбінцы, на жаль, мала ведаюць пра новыя выданні выдавецтва, а вось, напрыклад, з дапамогай «Звязды» яны змогуць «дайсці» да шматтысячнай чытацкай аўдыторыі, з дапамогай тэлебачання — да шматмільённай. За гэта асабліва ўдзячны сваім калегам.

## ВАРТЫЯ ПЕРАВЫДАННЯ

**«ЗВЯЗДА»:**

***— Давайце пагаворым пра тое, выданні якой скіраванасці сёння карыстаюцца найбольшай папулярнасцю?***

**Сяргей Пешын:**

— Колькі выдавецтваў — столькі і розных падыходаў у выданні кніг. «Беларусь» выпускае навуковую і навукова-папулярную літаратуру — кнігі па культуры, гісторыі, мастацтве. Значная колькасць нашых аўтараў жылі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя, яны ўжо не могуць удзельнічаць у аўтограф-сесіях.

Мы стараемся ладзіць прэзентацыі ў тых месцах, дзе зазвычай прысутнічаюць людзі, якія цікавяцца тэматыкай кнігі. Напрыклад, нядаўна ў музеі гісторыі горада Мінска прэзентавалі кнігу Сяргея Тарасава «Археалогія Беларусі. Час, таямніцы, скарбы, людзі». Сустрэча з аўтарам прайшла даволі плённа, завіталі тыя, хто цікавіцца гісторыяй і археалогіяй. А прэзентацыі ў кнігарнях у нас зазвычай праходзяць не вельмі ўдала — там лепш прадстаўляць сябе аўтарам мастацкай літаратуры.

Творцы мінулых стагоддзяў карыстаюцца папулярнасцю і ў сённяшніх чытачоў. Напрыклад, адна з апошніх нашых паспяховых кніг — гэта «Беларуская кухня», выдадзеная паводле матэрыялаў Нікіфароўскага. Гэта лідар продажаў, і мы перавыдавалі яе. Неаднаразова перавыдалі і «Гісторыю Беларусі» Доўнар-Запольскага, якая не страчвае сваёй актуальнасці. Перавыдавалі таксама і «Літоўскую гаспадыню». Гэтыя кнігі праходзяць не як дзяржзаказ, а як самаакупныя. Ёсць і добрыя сучасныя аўтары, якія працуюць з гістарычнай тэматыкай, — гэта Сяргей Тарасаў, Мікола Плавінскі.

**Алена Паўлава:**

— Статыстыка — рэч упартая. Паказчыкі выпуску друкаванай прадукцыі ў 2017 годзе дэманструюць па-ранейшаму вялікую долю вучэбнай літаратуры ў сукупным аб'ёме выпуску — 51 % у агульнай колькасці выпушчанай прадукцыі і 76 % у сумарным тыражы. Развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі дыктуе неабходнасць стварэння пад яе і выпуск адпаведнай вучэбнай літаратуры. Павялічыўся ў параўнанні з мінулым годам выпуск літаратурна-мастацкіх, навукова-папулярных выданняў. На мой погляд, вельмі запатрабавана кніга для дзяцей, якая развівае і выхоўвае.

Як куратар галіны кнігавыдання і кнігараспаўсюджвання, я шчаслівая тым, што на маё жыццё прыйшлася такая знакавая дата, як 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Таму мяне вельмі парадаваў выпуск многіх тэматычных кніг, прысвечаных гэтаму юбілею: «Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга», «Асветнік з Полацка», «Кніжныя скарбы Беларусі» («Беларусь»); «Сусветная спадчына Францыска Скарыны» ў серыі «Энцыклапедыя рарытэтаў», энцыклапедыя «Францыск Скарына», «Кніжныя скарбы Беларусі», «Францыск Скарына — чалавек свету» («Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі»); «Францыск Скарына на мовах народаў свету» (Выдавецкі дом «Звязда») і іншыя. Выдатнымі кнігамі было адзначана 950-годдзе Мінска — фотаальбомы «Мінск скрозь стагоддзі» і «Мінск. Спадчына сталіцы Беларусі», кніга для дзяцей «Прагулкі па Мінску»... Мяне радуе, што многія выдаўцы не зніжаюць узровень зместу праектаў і іх мастацка-графічнага афармлення. Асабліва хацелася б адзначыць работу дзяржаўных выдавецтваў «Беларусь», «Мастацкая літаратура», «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», выдавецкага дома «Беларуская навука», а таксама выдавецтваў прыватнай формы ўласнасці «Чатыре четверти», «Аверсэв», «Беловаргрупп», «Книжный дом», «Полиграфика» і «Тэхналогія».

## ЗАПАТРАБАВАНА ЗАМЕЖНАЯ КЛАСІКА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**«ЗВЯЗДА»:**

***— Цікава, наколькі ў той жа «Акадэмкнізе» прадстаўлены беларускія кнігі, наколькі замежныя?***

**Вольга Глухоўская:**

— На сённяшні дзень у нас зніжаецца тавараварот расійскіх кніг, а беларускіх — павялічваецца. Гэта тэндэнцыя радуе — і найперш яна радуе пакупнікоў. Праца з беларускімі выданнямі робіць нас больш эканамічна незалежнымі. З расійскімі выданнямі напрамую працаваць мы не можам, бо аб'ём нашых заказаў не надта вялікі. Мы ж гандлюем найперш вучэбнай, навуковай, даведачнай літаратурай, таксама добра прадстаўлены мастацкія творы. Калі выдаўцы завітаюць да нас, мы з задавальненнем раскажам ім, кнігі ў якім аб'ёме, фармацыі цікавяць чытачоў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# КНІЖНАГА СВЕТУ


Святлана ГУК.


Вольга ГЛУХОЎСКАЯ.

Вельмі хацелася б, каб выдаўцы друкавалі не толькі тыя выданні, што можна рэалізаваць сваім пастаянным кліентам і бібліятэкам, але і каб кнігі, асабліва мастацкая літаратура на беларускай мове, пастаянна прысутнічалі ў кнігарні. Бо здараецца, што пэўныя класікі хутка рэалізуюцца і больш не дадрукоўваюцца. Праходзіць два-тры гады, а для новых чытачоў гэтых класікаў у продаж так і не паступіла. Часта бацькі прыходзяць да нас са спісамі пазакласнай літаратуры, а мы ўжо не можам прапанаваць ім кнігі, бо яны распрададзеныя. Такім чынам, пакупнікі сыходзяць з кнігарняў. Дарэчы, не стае і даведачнай літаратуры. Выдатныя слоўнікі выпускала «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», але на сённяшні дзень яны цалкам прададзеныя. Цяпер знайсці добры беларускі слоўнік, напрыклад арфаграфічны, амаль немагчыма. Хіба што калі гэта зробяць прыватныя выдавецтвы. Добра, што сёння пачало развівацца ў бок беларускай кнігі выдавецтва «Попурри». Імі выдадзена цудоўная серыя «Мая беларуская кніга» — выданні невялікага фармату, даступныя па кошце. У гэтай серыі выйшлі многія айчынныя аўтары. Там выдаюць і айчынныя слоўнікі. Трэба разумець, што, калі на паліцы прадстаўлены слоўнік аднаго віду, пакупнік не будзе задаволены, — ён хоча выбраць штосьці на свой густ.

**«ЗВЯЗДА»:**

***— Што ж найболей цікавіць беларускіх чытачоў?***

**Вольга Глухоўская:**

— Калі вы бываеце ў краінах СНД, можаце заўважыць, што там амаль не прадаюцца кнігі на рускай мове. Ёсць тыя, хто і ў нас прапануе забараніць кнігі па-руску, — я лічу гэта зусім няслушным. Але адзначу, што ў нашых кнігарнях вельмі не хапае твораў вядомых замежных аўтараў у перакладзе на беларускую мову. Прычым гэта павінны быць не фаліянты, а зручныя па памерах і даступныя па кошце выданні. Попыт на такія кнігі надзвычайны, і іх хутка раскупляюць, яны рэдка залежваюцца.

**Уладзімір Андрыевіч:**

— Мы шмат кажам пра сучасныя формы працы — і найчасцей яны ахопліваюць Мінск. А я сам родам з вёскі, таму мяне хвалюе, як кнізе трапіць у невялікія населеныя пункты. Не ў кожным горадзе ёсць крамы «Белкнігі», затое ўсюды працуе «Белспажыўкааперацыя» і «Белпошта» — толькі праз іх кнігі могуць трапіць хаця б да жыхароў аграгарадкоў. Бо людзі, якія цікавяцца кнігамі і хочуць набыць іх, каб чытаць, жывуць паўсюль.

**Вольга Глухоўская:**

— Людміла Рублеўская ў газеце «СБ. Беларусь сегодня» зазвычай змяшчае кніжныя агляды. І вось менавіта пасля яе публікацый нам часта тэлефануюць людзі з раёнаў, якія цікавяцца тымі ці іншымі кнігамі. Часцей за ўсё гэта пенсіянеры. Аднак у кожнай кнігі свая аўдыторыя — і трэба на яе арыентавацца. У «Акадэмкнізе» гатовы і іншым зацікаўленым літаратурным крытыкам здымаць з паліцы любую кнігу і пад «слова гонару» даваць пачытаць — з гэтым няма праблем.

## АЎТОГРАФ-СЕСІЯ. БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ?

**«ЗВЯЗДА»:**

***— Калі пэўны аўтар самастойна выдаў кнігу, ці можа яна быць распаўсюджана праз «Белкнігу»? Раскажыце аб працэдуры, што трэба рабіць?***

**Святлана Гук:**

— Многія аўтары вельмі актыўныя і самі рэалізуюць свае кнігі. Але калі літаратар хоча, ён заўсёды можа прыйсці да нас у гандлёвы аддзел, узяўшы асобнік кнігі, і заключыць дагавор. Натуральна, трэба, каб кніга была выдадзена з усімі патрабаваннямі: быў прысвоены нумар ISBN, выхадныя даныя, штрых-код. Зазвычай на паліграфічных прадпрыемствах, дзе робіцца кнігі, змяшчаюць усе гэтыя звесткі. Аднак 10—15 % выданняў, з якімі звяртаюцца да нас, — непрыдатныя для далейшай рэалізацыі. Калі дагавор з аўтарам паспяхова заключаны, то яго кніга можа трапіць у шэраг гандлёвых пунктаў «Белкнігі». Натуральна, мы бяром пэўную ўзнагароду.

**«ЗВЯЗДА»:**

***— У «Акадэмкнізе» часам ладзяцца аўтограф-сесіі пісьменнікаў. Наколькі шмат людзей іх наведвае і ці прыносіць гэта эфект у плане распаўсюджвання кнігі і, можа быць, папулярнасці самой кнігарні?***

**Вольга Глухоўская:**

— Ці прыходзяць наведвальнікі на аўтограф-сесіі, залежыць і ад дня, часу, і ад рэкламы, і ад самога аўтара, яго твора. Часта хтосьці са знаёмых творцы піша рэцэнзію на кнігу, а ўнізе робіца прыпіска, што аўтограф-сесія адбудзецца ў такі дзень і такі час — гэта вельмі дзейсны сродак. На аўтограф-сесію можа прыйсці ўсяго некалькі чалавек. А на сустрэчу з паэтам Алесем Разанавым, напрыклад, якая адбывалася не так даўно, завітала вельмі шмат яго сяброў і паклоннікаў, і мы прадалі каля 40 кніг.

Часам можна правесці проста аўтарскія чытанні — пагутарыць пра кнігі, пра жыццё. Эфект не вельмі вялікі ад такіх сустрэч. Але, калі, напрыклад, завітае яшчэ і журналіст, рэзананс атрымліваецца большы. Без такіх мерапрыемстваў завабіць пакупнікоў у кнігарню ў наш час немагчыма.

Дарэчы, было б вельмі добра, каб выдавецтвы друкавалі невялікія плакаты сваіх кніг. Іх можна вешаць адразу каля ўвахода — такім чынам, заходзячы, чытач адразу зразумее, што з'явілася пэўная навінка і яе можна тут убачыць.

## ПІСЬМЕННІЦТВА ЯК ПРАФЕСІЯ

**«ЗВЯЗДА»:**

***— На жаль, сёння часта кажуць, што пісьменніцтва — гэта толькі хобі для сучасных аўтараў. Можа, ёсць думкі, што варта зрабіць, каб пісьменніцтва стала прафесіяй?***

**Сяргей Пешын:**

— Нашым пісьменнікам, з пункту гледжання чытача ў тым ліку, я б даў параду больш сачыць за зменамі, якія адбываюцца ў грамадстве. Бо сучасныя творцы пастаянна стараюцца паўтарыць Купалу, Коласа, Багдановіча. Нашы пісьменнікі садзяцца пісаць адразу класічную «нятленку», абапіраючыся на найлепшыя яе ўзоры. Аднак уся класіка ў свой час была напісана як актуальная, сучасная літаратура. І сёння трэба адпавядаць пэўным сучасным крытэрыям. Мы прапусцілі шмат актуальнай літаратуры. У нас, па вялікім рахунку, не было беларускіх фантастыкі, фэнтэзі, дэтэктыва... Чаму ў свой час быў так папулярны Караткевіч? Бо ён пачаў распрацоўваць жанры, якія да яго асабліва ніхто не чапаў, — гістарычны, дэтэктыўны раманы. Ён шукаў пэўныя павароты, сюжэты ў гісторыі. І гэта адразу пачало быць запатрабаваным у той час, бо з'явілася вялікай навізной. Але, на жаль, з Караткевіча яно пачалося, Караткевічам, у пэўным сэнсе, і скончылася. Нездарма Мікалай Чаргінец сёння ўзначальвае Саюз пісьменнікаў Беларусі — у свой час ён стварыў наш класічны паліцэйскі дэтэктыў. Калісьці я захапляўся яго кнігамі. Гэта было цікава і пазнавальна.

**Вольга Глухоўская:**

— Для некаторых сучасных пісьменнікаў пісьменніцтва з'яўляецца прафесіяй. Аднак гэта тыя людзі, якія здолелі з беларускай літаратуры пакрочыць у сусветную. Можна пісаць на любой мове, у тым ліку калі ты напісаў па-беларуску, трэба паклапаціцца, каб твор быў перакладзены на іншыя мовы, ці самастойна, ці з дапамогай прафесійных перакладчыкаў. Кніга найперш павінна быць добрай літаратурай. А ўжо потым у яе з'яўляецца нацыянальнасць. Любы шэдэўр вельмі лёгка перакласці на іншую мову.

Нашы пісьменнікі часта напішуць адзін твор — і ўжо лічаць, што іх творы геніяльныя. Думаюць, што іх кнігі павінны стаяць у цэнтры залы, «тварам» да наведвальніка.

Напрыклад, у выдавецтва «Эксмо» ніколі не трапіць з адной кнігай. Там падпісваецца дагавор, і аўтар павінен ці раз на месяц, ці нават чатыры разы на месяц, як Дар'я Данцова, прыносіць штосьці напісанае. І вось тады цябе будуць выдаваць, табой будуць займацца, цябе будуць рэкламаваць — і ні аб чым не будзе балець галава, акрамя як аб пісьменніцтве. А калі ты напісаў адну кнігу за ўсё жыццё ці за дзесяць гадоў, і ўсе табе нешта вінны... Літаратуры так не стварыць. Пісьменнікаў, якія праславіліся адным творам, адзінкі. Натуральна, такія кнігі (адзінкавыя ў аўтара) таксама павінны быць, — калі чалавек садзіцца і стварае іх, ён імкнецца адлюстраваць тое, што ў яго душы.

Калі ж разлічваць на пісьменніцтва як на прафесію, трэба гэтым займацца. І ці самому прасоўваць творы, ці наймаць літаратурнага агента. Дарэчы, да нас звярталіся літаратурныя агенты і беларускіх аўтараў — Андруся Горвата і Святланы Алексіевіч.

**Сяргей Пешын:**

— Я лічу, што кніга ўсё ж такі спачатку павінна прагучаць. А ўжо потым яе будуць перакладаць. Ніхто не захоча рызыкаваць брацца за невядомы твор. Некаторыя нашы аўтары, сапраўды, любяць штосьці напісаць — і адразу запатрабаваць высокія ганарары і асаблівыя ўмовы. Каб у беларускай літаратуры ўсё атрымалася, павінен прайсці час, — каб выспела некалькі аўтараў і быў відаць іх высокі ўзровень.

**Святлана Гук:**

— Я пажадала б сучасным аўтарам больш глядзець вакол, ацэньваць сітуацыю і адлюстроўваць сучаснасць — тое, чым мы жывём, чым дыхаем, што бачым. Не трэба імкнуцца быць падобным на некага.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

# Сонца і позірк паэзіі сяброўства

**У пярэдадзень XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, якая пачне сваю работу 28 лютага, Выдавецкі дом «Звязда» выпусціў кнігу перакладаў Юліі Алейчанкі «Вецер у валасах».**




Азербайджанец Мікаіл Мушфіг, рускія Сяргей Комаў, Андрэй Каровін, кітайцы Мэн Хаажань, Сюй Чжымо, літовец Майроніс, балкарац Саліх Гуртуеў, чачэнка Лула Куні, таджык Нізом Касім, украінцы Леся Мудрак, Сяргей Савін прадстаўляюць паэтычны свет некалькіх нацыянальных літаратур, некалькіх краін. Юлія Алейчанка ў бязмежным паэтычным свеце выбрала тых паэтаў і тыя творы, якія, відавочна, імпануюць яе ўласнаму мастацкаму светапогляду. «Праўда адвечная / ўстане на поўны рост — / як з дробнай хвілі ствараецца вечнасць. / Сэнс жыцця існы пануе наўпрост: / мрэ чалавек, / ды жыве заўжды чалавечнасць», — паўтарае за таджыкам Нізомам Касімам перакладчыца. Прачытаўшы ў перакладзе Юліі Алейчанкі кітайскага паэта Сюй Чжымо («Я воблака сярод нябёс, / Што ў тваёй хвалі адаб'ецца...»), неўпрыкмет загарэешся інтарэсам да паэтычных сімвалаў Паднябеснай. Як і найлепшыя беларускія майстры паэтычнага перакладу Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Васіль Зуёнак, маладая паэтэса ўпэўнена ў вартасцях тых сімвалаў і вобразаў, на якія яна звярнула ўвагу. Можна смела сказаць, што мастацкі, паэтычны густ Юліі Алейчанкі дапаможа нашаму айчыннаму чытачу ў вандроўках па паэтычным Сусвеце.

Дарэчы, перакладчыца — укладальнік адметнага творчага праекта «Светлыя знакі: паэты Кітая», кніжнай серыі, у якой пабачылі свет дзесяць вершаваных зборнікаў мастакоў слова Паднябеснай. І гэты факт таксама дадае ўпэўненасці, што з часам шмат большая анталогія паэтычных перакладаў Юліі Алейчанкі прыйдзе да чытача. А зараз усё новыя і новыя здзейсненыя ёю перавўвасабленні паэзіі творцаў розных нацыянальных літаратур друкуюцца на старонках часопісаў «Полымя», «Маладосць», газеты «Літаратура і мастацтва».

Сяргей ШЫЧКО.

# Мастацкае слова як сімвал паразумення

**У час правядзення XXV Мінскага міжнароднага кніжнага кірмашу-выстаўкі (28 лютага — 4 сакавіка) адбудзецца Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час». У яго праграме — не толькі пленарнае пасяджэнне, але і прэзентацыя многіх праектаў, звязаных з мастацкім перакладам.**

Адна з імпрэз будзе прысвечана зборніку беларускай паэзіі «Беларускі матыў», які толькі што пабачыў свет у выдавецтве «Джангар» (Калмыкія, Эліста). Перакладчык твораў Францыска Скарыны, Янкі Купалы, Уладзіміра Дубоўкі, Рыгора Барадуліна, Міхася Пазнякова, Таццяны Сівец, Юліі Алейчанкі — старшыня Астраханскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Расіі Юрый Шчарбакоў.

Кніга на беларускай і рускай мовах выйшла ў серыі «Цэнтр літаратурнага перакладу», — расказвае Юрый Шчарбакоў. — У Астрахані, суседняй Элісце мы ствараем своеасаблівую атмасферу мастацкага сяброўства. Імкнёмся развіваць ініцыятывы, рэалізацыя якіх дазваляе сябраваць паэтам, а народам Расіі, Беларусі, іншых постсавецкіх краін — праз вершы адкрываць тыя працэсы, тыя з'явы, якія характарызуюць сучаснае жыццё. У Астрахані праводзяцца розныя конкурсы паэтычнага перакладу. Да ўдзелу ў іх мы запрашаем і беларусаў. Рады, што ў Беларусі шмат што робіцца па прадстаўленні літаратур народаў Расіі на беларускай мове. Ведаю, што ў апошні час газеты «Літаратура і мастацтва», «Звязда», часопісы «Полымя», «Маладосць» друкавалі паэтаў Татарстана, Удмуртыі, Калмыкіі, Чувашыі, Башкартастана.

Са сваімі творчымі падарункамі на сімпозіум «Пісьменнік і час» прыедуць літаратары з Казахстана, Літвы, Арменіі, розных рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі.

Мікола БЕРЛЕЖ.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой»

| Лот | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Шкаф, 11 шт. | 1 428,13 |
| 2 | Трансформаторная подстанция, 2 шт. | 240,00 |
| 3 | Битумоварка, 3 шт. | 360,00 |
| 4 | Стол рабочий, 5 шт. | 365,46 |
| 5 | Автомагнитола с инв. № 1057 | 185,22 |
| 6 | Бак для нефтепродуктов с инв. № 778 | 3,68 |
| 7 | Бак для нефтепродуктов с инв. № 822 | 33,60 |
| 8 | Битумный котел с инв. № 933 | 53,70 |
| 9 | Вибратор с инв. № 1035 | 68,94 |
| 10 | Вибростанок с инв. № 1010 | 512,40 |
| 11 | Емкость объем 2 м.куб с инв. № 74 | 120,00 |
| 12 | Заточный станок с инв. № 1048 | 37,09 |
| 13 | Кассовый аппарат с инв. № 1039 | 89,10 |
| 14 | Колонка с инв. № 782 | 222,95 |
| 15 | Колонка с инв. № 858 | 109,62 |
| 16 | Колонка с инв. № 857 | 123,42 |
| 17 | Компрессор ЗИФ-55 с инв. № 4504 | 51,44 |
| 18 | Молот кузнечный с инв. № 468 | 623,16 |
| 19 | Печатная машинка Samsung с инв. № 6674 | 69,59 |
| 20 | Пишущая машинка с инв. № 1031 | 112,86 |
| 21 | Пишущая машинка с инв. № 1041 | 74,17 |
| 22 | Пишущая машинка «Ятрань» с инв. № 6672 | 30,98 |
| 23 | Подъемник тг с инв. № 986 | 582,36 |
| 24 | Приставка с инв. № 6681 | 12,70 |
| 25 | Прихожая с инв. № 6693 | 38,02 |
| 26 | Рубильный станок с инв. № 87 | 120,00 |
| 27 | Сварочный аппарат с инв. № 4590 | 252,31 |
| 28 | Сварочный аппарат (пр-во Польша) с инв. № 4591 | 1 049,51 |
| 29 | Сверлильный аппарат с инв. № 998 | 183,84 |
| 30 | Сети телефонизации и радио с инв. № 3105 | 4 884,99 |
| 31 | Станок для гнутия арматуры с инв. № 88 | 120,00 |
| 32 | Станок заточный самодельный с инв. № 95 | 120,00 |
| 33 | Станок протяжной с инв. № 85 | 120,00 |
| 34 | Станок фрезерный с инв. № 84 | 120,00 |
| 35 | Станция штукатурная с инв. № 77 | 120,00 |
| 36 | Телевизор с инв. № 1018 | 37,67 |
| 37 | Телевизор «Горизонт» 51 СТ с инв. № 999 | 86,86 |
| 38 | Тележка на рельсах с инв. № 78 | 120,00 |
| 39 | Факс с инв. № 6695 | 711,53 |
| 40 | Факс с инв. № 6694 | 596,66 |
| 41 | Факс с инв. № 1042 | 122,82 |
| 42 | Факс с инв. № 1052 | 989,75 |
| 43 | Факс с инв. № 1061 | 412,62 |
| 44 | Факс Panasonik с инв. № 1600 | 214,26 |
| 45 | Факс Sharp UX-53 EU с инв. № 6696 | 184,62 |
| 46 | Факс «Панасоник» с инв. № 4442 | 317,77 |
| 47 | Холодильник с инв. № 7813 | 42,65 |
| 48 | Холодильник с инв. № 1008 | 27,59 |
| 49 | -3552 USB Transcenot 86 B, 3 шт. | 28,50 |
| 50 | 745 Алкотест | 34,25 |
| 51 | 370 Алюминий | 120,00 |
| 52 | -1456 Аппарат телефонный, 2 шт. | 18,00 |
| 53 | -9508 Балки ж/б б/у, 4 шт. | 480,00 |
| 54 | -9508 Балки ж/б б/у, 4 шт. | 480,00 |
| 55 | -9509 Блоки г/с б/у обрезки, бой, 24 шт. | 598,08 |
| 56 | 418 Багры пожарные, 2 шт. | 240,00 |
| 57 | 380 Ванна б/у | 36,25 |
| 58 | 30 Вентрешетки, 67 шт. | 1 779,52 |
| 59 | -9512 Вибратор б/у, 5 шт. | 343,15 |
| 60 | 41 Гвозди строительные, 97 шт. | 121,25 |
| 61 | 424 Грабли | 1,92 |
| 62 | 1097 Дверь подвальная, 19 шт. | 1 225,69 |

| Лот | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 63 | 428 Дегозащита, 5 шт. | 600,00 |
| 64 | 51 Доска п/оконная, 128 шт. | 432,64 |
| 65 | 49 Доска подоконная, 16 шт. | 359,20 |
| 66 | 1479 Дрель аккумуляторная | 48,30 |
| 67 | 744 Жалюзи, 3 шт. | 21,48 |
| 68 | 55 Жалюзные решетки | 12,41 |
| 69 | 613 Замок навесной, 6 шт. | 17,64 |
| 70 | -2136 Замок поч., 9 шт. | 1,26 |
| 71 | 60 Знаки дорожные, 17 шт. | 78,88 |
| 72 | 429 Зубило, 96 шт. | 11 520,00 |
| 73 | 535 Известь, 4 365 | 698,40 |
| 74 | 435 Калькулятор, 4 шт. | 20,56 |
| 75 | 1960 Калькулятор-1, 3 шт. | 31,68 |
| 76 | 513 Каска строительная, 5 шт. | 10,00 |
| 77 | 870 Кассовый ордер, 23 шт. | 0,46 |
| 78 | -9629 Кирпич керамический б/у | 120,00 |
| 79 | -9506 Кирпич силик. 250х120х85 б/у, 7 шт. | 840,00 |
| 80 | КО-1 (ПЭВМ), 5 шт. | 0,25 |
| 81 | 1068 Кресло театральное, 21 шт. | 2 520,00 |
| 82 | 440 Лопата, 6 шт. | 6,42 |
| 83 | 567 Лотки ж/б, 3 шт. | 12,78 |
| 84 | 444 Луна | 17,28 |
| 85 | -4605 Магнитные карточки, 9 шт. | 2,79 |
| 86 | 448 Молоток Сат. | 13,74 |
| 87 | 1815 Наволочка 70х70, 25 шт. | 45,25 |
| 88 | 458 Напильник, 2 шт. | 4,02 |
| 89 | -9574 Насос «Гном» б/у неиспр., 2 шт. | 93,50 |
| 90 | -9575 Насос б/у неиспр., 2 шт. | 21,68 |
| 91 | -9522 Насос б/у нераб. | 10,84 |
| 92 | -9524 Насос «Ручеек» б/у | 15,98 |
| 93 | -9576 Насос ЭЦВ б/у неиспр., 3 шт. | 139,08 |
| 94 | 1127 Носилки, 3 шт. | 7,53 |
| 95 | 976 Одеяло п/шерстяное, 3 шт. | 27,18 |
| 96 | 978 Одеяло п/шерстяное 09с-3 | 6,65 |
| 97 | 9157 Окно ОД 10.9.9, 3 шт. | 678,27 |
| 98 | -9525 Осушитель воздуха б/у | 135,00 |
| 99 | 757 Отбойный молоток | 43,02 |
| 100 | 131 Отвод, 31 шт. | 3 720,00 |
| 101 | 233 Отвод, 1 007 шт. | 292,03 |
| 102 | 9115 Поддоны деревян., 2 шт. | 19,30 |
| 103 | -1780 Переноска д. 10, 2 шт. | 14,38 |
| 104 | 519 Перчатки диэлектрич. | 1,20 |
| 105 | 9470 Пила ручная электрич. | 77,40 |
| 106 | 1789 Планка торцовая, 209 шт. | 940,50 |
| 107 | 469 Плоскогубцы, 5 шт. | 14,80 |
| 108 | 170 Побелка сухая, 9 шт. | 1,53 |
| 109 | 9160 Поддон для бордюра П2-1, 4 шт. | 14,80 |
| 110 | 4633 Поддоны Радош., 51 шт. | 367,20 |
| 111 | 145 Поддоны (с ценой), 201 шт. | 703,50 |
| 112 | 4649 Поддоны 1030х1030, 28 шт. | 257,04 |
| 113 | 4659 Поддоны 3 см | 11,39 |
| 114 | 4748 Поддоны ДОЗ, 2 шт. | 23,00 |
| 115 | 9169 Поддоны П2-2,4 930х1230, 5 шт. | 47,30 |
| 116 | 977 Подушка 58,х58, 4 шт. | 10,08 |
| 117 | 758 Подушка пост., 3 шт. | 6,90 |
| 118 | 1755 Подушка 68х68, 3 шт. | 11,34 |
| 119 | 979 Покрывало, 2 шт. | 6,44 |
| 120 | 1567 Полотно Г9, 5 шт. | 415,20 |
| 121 | 9355 Предохранитель ПН2, 10 шт. | 33,60 |
| 122 | 857 Пробка, 6 шт. | 4,44 |
| 123 | 136 Пробка радиатора, 39 шт. | 12,48 |
| 124 | 242 Пробка радиатора, 553 шт. | 193,55 |

| Лот | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 125 | 900 Пробка-анкер (крепежная), 10 шт. | 11,80 |
| 126 | -9529 Провод б/у, 3 шт. | 0,33 |
| 127 | 9457 Провод ПВС3,0х1,5, 120 шт. | 74,40 |
| 128 | 9532 Провод 2х6 б/у, 100 шт. | 72,00 |
| 129 | 9533 Прожектор б/у | 13,68 |
| 130 | 1814 Простынь 1,5 м, 40 шт. | 104,80 |
| 131 | 463 Противогаз, 318 шт. | 381,60 |
| 132 | 753 Пылесос | 17,66 |
| 133 | 1462 Радиаторы 2К60П, 14 шт. | 144,34 |
| 134 | 573 Рама, 17 шт. | 103,70 |
| 135 | 178 Решетки | 120,00 |
| 136 | 901 Ригель под шипы, 23 шт. | 101,20 |
| 137 | 9534 Розетка б/у, 3 шт. | 10,05 |
| 138 | -9535 Розетка РА 10-214 б/у, 6 шт. | 9,60 |
| 139 | 9536 Розетка РА 16-263 б/у, 2 шт. | 6,88 |
| 140 | 9537 Розетка РА16-255 б/у, 7 шт. | 7,42 |
| 141 | 9539 Рубильник б/у | 12,29 |
| 142 | 485 Санитарная сумка, 4 шт. | 120,00 |
| 143 | 1361 Сапоги раб. гвоздевые, 2 пары | 10,08 |
| 144 | 192 Сиденье к унитазу, 4 шт. | 6,04 |
| 145 | 191 Сифон, 22 шт. | 25,08 |
| 146 | 189 Смеситель, 4 шт. | 26,76 |
| 147 | 483 Стамеска, 87 шт. | 10 440,00 |
| 148 | 196 Стекло (бой), 60 кг | 7 200,00 |
| 149 | 207 Стеклоткань, 88 кг | 45,76 |
| 150 | 774 Стропа, 4 шт. | 261,20 |
| 151 | 1370 Стулья, 17 шт. | 185,47 |
| 152 | 523 Ступени, 0,771 куб. | 22,77 |
| 153 | 9578 Счетчик СО б/у, 6 шт. | 34,50 |
| 154 | 9541 Счетчик электрический б/у, 3 шт. | 85,86 |
| 155 | 624 Тачка, 2 шт. | 104,60 |
| 156 | 750 Телефонный аппарат, 3 шт. | 14,37 |
| 157 | 9542 Тепловентилятор б/у | 37,08 |
| 158 | 492 Топор, 6 шт. | 20,52 |
| 159 | 325 Трансформатор, 2 шт. | 205,18 |
| 160 | 328 Трап чугунный, 11 шт. | 36,08 |
| 161 | 581 Туалет, 2 шт. | 60,82 |
| 162 | 9545 Тэн б/у, 5 шт. | 14,20 |
| 163 | 4707 Угольник соединит., 52 шт. | 104,00 |
| 164 | 564 Флаг | 0,02 |
| 165 | 9066 Флаг | 35,83 |
| 166 | 876 Флэш-карта по 2 GB, 4 шт. | 20,80 |
| 167 | 538 Форма б/у, 2 шт. | 240,00 |
| 168 | 541 Форма забора, 4 шт. | 246,72 |
| 169 | 1243 Черепица вентиляционная, 37 шт. | 51,06 |
| 170 | 1254 Черепица проходная, 10 шт. | 13,20 |
| 171 | 1249 Черепица снегозадерживающая, 62 шт. | 78,74 |
| 172 | -9548 Щиток ЩО б/у | 21,52 |
| 173 | 1537 Эл. плита 3-комф. | 115,56 |
| 174 | 364 Электроды, 14 шт. | 47,74 |
| 175 | 1563 Электроплита 325947 | 130,12 |
| 176 | 9471 Электротепловентилятор | 200,66 |
| 177 | 9011 Элемент тонкой очистки топлива, 2 шт. | 3,70 |
| 178 | 1984 Элемент фильт. возд. МАЗ, 2 шт. | 25,54 |
| 179 | 4568 Ящик для инструмента | 7,10 |
| 180 | 9572 Ящик для инструмента б/у | 8,16 |
| 181 | 619 Ящик каменщика, 13 шт. | 753,48 |
| 182 | 505 Ящик ружейный, 11 шт. | 1 320,00 |
| 183 | 9560 Ящик силовой б/у | 32,52 |
| 184 | 506 Ящик-сейф | 120,00 |
| 185 | 551 Бензопила № 2 | 154,81 |

*Местонахождение лотов:* Минская обл., г. Мядель, ул. Юбилейная, д. 47

*Торги в отношении вышеуказанного имущества проводятся впервые.*

*Окончание приема заявлений в* 16.00 05.03.2018 г.

УСЛОВИЯ

Задаток для участия в аукционе – 10 % от начальной стоимости лота. Шаг аукциона – 5 % от начальной стоимости лота.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу затраты по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 12.03.2018 в 12.00 (регистрация участников с 11.15 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1127**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi

До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000 в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой» (Лот №__), проводимом 12 марта 2018 г.

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1122.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Шукелович Чеслав Зенонович, тел. 8 (029) 999 91 12.

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

**Организатор аукциона – ООО «Фрондера»: 8 (029) 305-86-50.**
**• e-mail: frondera@mail.ru**

---

**Центр Промышленной Оценки**
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| **Продавец** | ОАО «БПС-Сбербанк»; г. Минск, бульвар им. Мулявина, 6 | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| **А 5/к. Здание общежития** | Здание общежития | 2071 кв. м | 500/С-28890 | г. Минск, ул. Цнянская, д. 12 |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок общ. пл. 0,2533 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания общежития с учебным пунктом и кассовым узлом | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 2 204 487,60 белорусских рублей | | | |
| **Обременения** | Предмет аукциона частично обременен договорами найма | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на расчетный счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| В течение **30** (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **13.03.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **06.03.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by | | | |

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 450/С-28407 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин «Промтовары»), площадью 86,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Подлесная, 1 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 425450100000002192 (назначение – обслуживание зданий и сооружений), площадью 0,0134, расположенный по адресу: г. Слоним, ул. Подлесная, 1 |
| Начальная цена продажи | 13 440 руб. (тринадцать тысяч четыреста сорок рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 1 344 руб. (одна тысяча триста сорок четыре рубля) |
| Условия аукциона | аукцион без условий |
| Продавец | Слонимский филиал Гродноблпотребобщества, 231800 г. Слоним, ул. Маяковского, 6, 8-1562-215-91 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 21 февраля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленное организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатор аукциона извещается участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 30.09.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 16 февраля 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

■ Уражанні

# І мастак, і паэт, і музычны эстэт

## Юбілейнае крэшчэнда Рыгора Сітніцы

Што можа быць больш дасканалым, чым мелодыя з вершам? Калі яны разам і ідуць поруч да канца, поспех гарантаваны. Нечуваная гармонія мелодыі і верша падуладна Рыгору Сітніцу. Тоны, паўтоны ткуць непаўторнае музычна-лірычнае дзіва пад акампанемент... завірухі. У аўтарскай літаратурнай вечарыне Рыгора Сітніцы «Канцэрт для скрыпкі і завірухі» ў Вялікай зале Белдзяржфілармоніі сышліся майстэрства паэта і імпэт музыкі. З першых акордаў ансамбля салістаў «Класік-Авангард», які суправаджаў дзею, стала зразумела: музыка — незаменная спадарожніца паэзіі Сітніцы. Нядзіўна, гэтага патрабуе палкая душа паэта, што пацвярджае яго новая кніга вершаў «Ток» («Чатыры чвэрці», 2018), дыханне якой вызначала настрой завірухі.

*Гэты снег, панове, / нібыта магічнае нейкае шоу, / Што душу вяртае ў пачатак, / туды, дзе святло найперш. / І, напэўна, снег гэты / дзеля таго й прыйшоў, / Каб наўмысна патрапіць у верш.*

Ён «цярушыцца проста ў душу» разам з адмысловымі музычнымі пералівамі. Стоены рух мелодыі, ласкавыя крокі пасажаў — невымоўным натхненнем агортваў аркестр «Класік-Авангард». Чаргаванне мелодый аркестра і вершаў Рыгора Сітніцы — як дамова аб сакральным. Скрыпічныя хвалі прабіваліся праз завіруху. І мелодыя быццам ператваралася ў разважлівы расповед. Завіруха ў Сітніцы ўспрымлівая, густоўная, сшытая з мелодый Станіслава Манюшкі, Дзмітрыя Смольскага, Гражыны Бацэвіч, Альфрэда Шнітке...



Маэстра Уладзімір Байдаў быццам варажыў неверагодна таемнымі музычнымі кампазіцыямі, задаючы хуткасць завірусе. Снежны спеў закалыхваў, накрываючы пледам асалоды. І раптам усю сутнасць Сітніцы вызначыла яркае магічнае крэшчэнда, якое змог перадаць аркестр. У ім — і пошукі, і заспакаенне, і парывы, і забыццё, і ўзлёт, і замілаванне.

Узляцець за песняй скрыпкі і ўяўвіць: вось гэты творчы змагар ідзе заснежаным вечарам і пазірае ў нябёсы з падзякай за новы верш... Сітніца побач з аркестрам — як слухач гэтай дзіўнай гісторыі пра сябе. Пранізлівая музыка быццам выпісвала партрэт творцы, угадваючы схільнасці і думкі.

*...І ў родных нябёсах душой патануць і вачыма; / І, роўняю стаўшы мурашцы, рамонку, траве, / Падумаць не страшна, што некалі ўсё ж пазаве / Усіх нас дадому нябесная наша Айчына.*

І пакацілася завіруха ноткамі блюза (разнажанравыя прапановы былі ў той вечар), як вандроўка па сэнсах паэта.

*Кропля-секундамі час / капае — у забыццё... / Гэтак, напэўна, праз нас / Наша ўцякае жыццё.*

Завіруха душы Сітніцы... Ці не яна начаравала яго адмысловы альбом «Простыя рэчы» («Звязда», 2017)? Фотаздымкі, 140 рэпрадукцый мастацкіх твораў, каля 50 вершаў прэзентуюць творчы жыццяпіс мастацкага волата Сітніцы. «Мастак — паэт. Колеры гучаць. Колеры ўсхвалявана спавядаюцца. Колеры рыфмуюцца. Лініі гавораць. Лініі жывуць. Лініі бліскавічаць імгненне», — выказаўся пра Сітніцу Рыгор Барадулін. Россып думак-абярэгаў захаваны ва ўступным слове Рыгора Барадуліна «Паэт-Мастак», што змешчана ў альбоме. Стары, але надзейны ліхтар не шкадаваў святла. Якім шчасцем было быць у яго святле Рыгору Сітніцы. Два Рыгоры — два вялікія караблі, якія не маглі не сустрэцца. «У вершах Рыгора Сітніцы — раскутасць і ашчаднасць, аратайнасць і панавітасць, апантанасць і раздумнасць, прыпар шчодрадайнасці й прысмак смутку, балязванне гуку і раскоша майстэрства», — гаварыў Рыгор Барадулін.

*Пра што вы, поле, сцяжына, камень? / Пра што імгненна? Пра што — вякамі?/ Адбітак, водгулле, рэха, след... / Калісь аднойчы я стану вамі, / Тады спасцігну ваш альфабэт.*

Неабдымная натура Сітніцы прагне музычнага палёту. Дапамагчы дакрануцца крыламі сэрцаў, што чакаюць паэтычнага натхнення. Абудзіць найглыбейшыя струны-мроі душы. Энергічнае танга, начараванае «Класік-Авангардам», — як нельга лепш: і такой мусіць быць душа Сітніцы. Аркестр у сінтэзе з вершамі вызначылі танец для завірухі.

*Жоўтае лісце на змоклым асфальце / Пераступаем, шукаючы выйсця... / Гэта было, прыгадай, у Вівальдзі... Гэта ў душы маёй перапляліся / Сцежкі вільготныя, жоўтае лісце...*

«Кола грукатала, зорка чаравала» — як моцны вецер уварваўся ў завірухавую дзею гурт «Палац». Кантрастам для аркестра. Што ўсё ж больш пасуе творчасці Р. Сітніцы: разважлівасць «Класік-Авангарда» ці моц і шалёнасць/раскаванасць «Палаца»? «Засядлаю коня варанога», — падпяваў Алегу Хаменку Рыгор Сітніца. А потым яшчэ: «Добры вечар, красная дзяўчына. А дзе ж твая шчасная доля?»

*Першаснежнае дзіва сыходзіць з нябёс... / А я вышняю цішаю верш гэты вышыю, / Першаснежжам журбу сваю зацерушу / І стэрыльна-нябесную белаю цішаю / Забінтую падрапаную душу.*

Ступаеш па крохкай замеці, правальваючыся ў снег паэзіі. Хочацца зноў і зноў азірнуцца: сляды на снезе — пячаткі замілавання. Вачыма — уверх, думкамі — углыб і зноў — у рой музычных сняжынак. Хай сыпле снег паэзіі няспынна! Хай дзьме завіруха на біс Астарам П'яцолам, Генрыхам Вагнерам, Джонам Уільямсам, Каралем Шыманоўскім, Стэфанам Грапэлі, Яўгенам Глебавым.

*Падпявай, завея, паэту ў варыяцыях на Песні песняў Саламона: Як пячатку, мяне пакладзі ты на сэрцы сваім, / Як пярсцёнак, мяне на вякі на руку надзень.*

Пульс завірухі гарачы: колькі сэрцаў тым вечарам наталіла гэтая моц музыкі і верша. Стоенасць думак, узлёт. Музыка — як карункі для вершаў Сітніцы. У абдымках музыкі расчыніць душу насцеж, «зашыцца ў тваю слязу».

*На тваіх палахлівых грудзях / астываюць мае пацалункі... / Як лазе вінаграднай цяпло раздаюць палесцінскія промні... / Я ўжо больш, Суламіта, / нічога не ўмею і толькі люблю, / І пяшчота звярынай журбой раздзірае нутро мне.*

**Наталля СВЯТЛОВА.**

## ЭРУДЫТЫ САБРАЛІСЯ Ў БНТУ

**Самыя эрудзіраваныя маладыя людзі краіны сабраліся ў мінулую суботу ў сталіцы, каб высветліць, хто з іх лепшы. У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце прайшоў IV Рэспубліканскі турнір для навучэнцаў 7—11 класаў «Кубак палітэха».**

Каля 300 маладых эрудытаў прадставілі 50 каманд з 20 гарадоў, сярод якіх Віцебск, Магілёў, Гомель, Мазыр, Полацк, Мінск. Праграма мерапрыемства складалася з інтэлектуальных конкурсаў кшталту «Што? Дзе? Калі?», камандный «Сваёй гульні» і «Медыя мікса». Назіралі за маладымі ўдзельнікамі вопытныя члены журы, у складзе якога былі гульцы і рэдактары беларускага тэлевізійнага клуба «Што? Дзе? Калі?» і гульні «Брэйн-рынг».

У выніку сярод юніёраў першае месца заняла каманда «Постіронія лёсу» з Гомеля, на другім месцы — Me Gusta (Віцебск) і замыкае тройку лідараў «Карл-Маркс-штадт» (Мінск). У ювеналаў месцы размясціліся наступным чынам:

на першым — каманда з Лагойска «Вялікі праігравальнік», на другім і трэцім — мінскія каманды «Бохан» і «Бананатэхналогіі» адпаведна.

Паводле слоў **старшыні прафсаюзнага камітэта ППА студэнтаў БНТУ Анастасіі БАРАБАНАВАЙ**, падобныя мерапрыемствы дапамагаюць і бліжэй пазнаёміць дзяцей з універсітэтам. «Сярод удзельнікаў тут сабраліся навучэнцы школ, гімназій і ліцэяў. Гэта нашы патэнцыйныя абітурыенты. Мы знаёмім дзяцей з усёй краіны адзін з адным і з магчымасцямі БНТУ. Затым у сяброўскай абстаноўцы праводзім інтэлектуальныя гульні. Дарэчы «Кубак палітэха» сёлета стаў яшчэ і этапам Вялікага кубка Беларусі. Вынікі ўлічваюцца як адборачны этап у рэспубліканскім турніры сярод усіх школ краіны», — адзначыла Анастасія Барабанава.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

■ Чулі?

## А ДЗЕ «МЕСЦА ДЛЯ ПАЦАЛУНКАЎ»?

### У Беразіне ўстановяць спецыяльны знак

**9 лютага ў Беразіне ў скверы насупраць Цэнтральнай раённай бібліятэкі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё знака «Месца для пацалункаў». Мерапрыемства пройдзе ў рамках Усебеларускай акцыі «За любімую Беларусь!», ініцыяванай Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі.**

Устанавіць такі знак прапанаваў Бярэзінскі раённы камітэт БРСМ. З дапамогай таблічкі «Месца для пацалункаў», выраблненай у стылістыцы дарожных знакаў, саюз моладзі прапануе жыхарам і гасцям горада праявіць свае пачуцці. Каля новага знака можна будзе рабіць сэлфі, прызнавацца ў каханні, рабіць прапанову рукі і сэрца ну і, вядома, цалавацца.

Адкрываць новы тэматычны знак пацалункам будзе закаханая пара адразу пасля заключэння шлюбу ў загсе. Каля яго арганізуюць тэматычную фота-зону «За любімую Беларусь». На думку ініцыятараў устаноўкі знака, з'яўленне такога рамантычнага месца ў Беразіне напоўніць сэрцы жыхароў дабрынёй і любоўю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# СТАЦЬ НІНДЗЯ




Незвычайны батутны цэнтр Flash Park працуе ў сталіцы — менавіта тут можна не толькі паскакаць на аматарскім і прафесійным узроўнях, але і пабываць у адзіным у Беларусі ніндзя-парку. Паўнавартасны ніндзя-парк складаецца з 12 перашкод, таксама прадугледжаны розныя ўзроўні складанасці. Тут можна перабягаць «слізкае бервяно», праспабаваць пераадолець трасу на кольцах ды і проста паляжаць у паралонавых кубіках. Увесь батутны цэнтр займае каля 500 квадратных метраў і дзеліцца на тры асноўныя зоны: зона батутаў (іх дванаццаць) і мяккай ямы, ніндзя-парк і рэлакс-зона. На батутах з задавальненнем бавяць час як дзеці, так і дарослыя, бо гэта не толькі весела, але і карысна для здароўя: узровень нагрузкі пры скачках на батуце ў тры разы вышэйшы, чым пры бегу.





**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

# «МАЛА ТВОР НАМАЛЯВАЦЬ, — ТРЭБА І ЛЮДЗЯМ ПАКАЗАЦЬ...»



**Можа, анекдот, а мо і насамрэч было: сужэнцы ўдваіх вярталіся з гулянкі. «Ты праўду казала, — нарэшце згадзіўся муж, — добра, як на Новы год ды мала п'еш. Можна ўсіх праведаць, павіншаваць, на цвярозую галаву добрае кіно паглядзець... Давай і стары Новы год так адзначым?» Жонка ў адказ: «Ды пабойся бога... Глянь у мабільнік на чысло... Там люты ўжо».**

І сапраўды, як ні дзіўна, люты. Але ж папярэдні конкурсны здымак (кіньце вочкам на верхні) друкаваўся ў снежні *(«Звязда» за 12.12.2017)*, свет чакаў навагоддзя, рыхтаваўся да свят... Не дзіва, што якраз гэтая падрыхтоўка і ўбачылася на здымку:

*Падарункі шле Пахом:*
*Тут зіма — суседу ў дом.*
*Жонцы*
*(дужа будзе рада!) —*
*Шапка з норкі*
*на Каляды,*
*Дзецям — лыжы, палкі,*
*санкі,*
*Цешчы —*
*сушкі-абаранкі...*
*Хто з Пахомам*
*як трымаўся,*
*Так Пахом*
*і «адкупляўся».*

Што цалкам лагічна, як лічыць **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў**, хоць і згадвае горкае мужчынскае прызнанне: «Некалі ў дзіцячым садку намалюеш каляку-маляку, падорыш маме на 8 Сакавіка — яна і рада! З жонкай гэты нумар чамусьці не праходзіць».

З таго ж канверта і сумнаватае прызнанне: «Пышна цяпер святкуюцца і Каляды, і Новы год. Людзі робяць падарункі, вешаюць на ялінкі прыгожыя цацкі, купляюць нечуваныя прысмакі. А некалі ж, калі я хадзіла ў школу, — успамінае шаноўная аўтарка, — усё было па-іншаму. Напрыклад, пакуначкі для падарункаў мы рабілі самі: са школьных сшыткаў вырывалі двайныя лісты, тры бакі іх — склейвалі, унізе ды пасярэдзіне малявалі ёлку, цацкі, птушак — хто што ўмеў... Потым Дзед Мароз на школьным ранішніку гэтыя «торбачкі» раздаваў — ужо са жменяй прысмакаў.

Самі дзеці ўпрыгожвалі і ялінкі. Малодшыя з паперы выразалі сняжынкі, іголкай нанізвалі іх на нітку. Паслядоўнасць была такая: сняжынка, кавалачак саломкі, зноў сняжынка... Такім чынам атрымліваліся доўгія гірлянды, якія старшакласнікі вешалі на ёлку.

І ўсе касцюмы, — прыгадвае спадарыня Валянціна, — таксама былі самаробныя: бацькі ды настаўнікі дапамагалі хіба ў нечым складаным...

Усе чакалі свята.

Цяпер трохі не тыя ўжо адчуванні. І не тое чаканне. Але ж ёлку я па-ранейшаму стаўлю і Новы год сустракаю: заўжды — з надзеяй на лепшае».

Ці вам казаць, што часам гэтыя надзеі праўдзіцца, часам — не. Адкуль (і ўсё з таго ж канверта) чарговы варыянт подпісу да здымка:

*Пятрусь*
*для каханай дзяўчыны*
*Гадамі карпеў*
*над карцінай.*
*Дамоў ёй прынёс і...*
*Кіно:*
*Дзяўчына за іншым*
*даўно.*

А таму — як трэба разумець — адправіла кавалера (прычым разам з карцінай) туды, адкуль прыйшоў.

І правільна зрабіла. Бо замужам.

Магла быць яшчэ адна ўважлівая прычына, якую ўбачыў на здымку **спадар Савосцік з Бабруйска**:

*Закаханы ў дзяўчыну,*
*Малюваў мастак карціну.*
*Толькі дзеўка*
*не прымае,*
*Бо сцяны такой не мае.*

Адкуль — намёк мастаку: для каханай спачатку патрэбен дом.

Проста гэта сказаць, а вось пабудаваць... За якія, спытаеце, грошы...

*Лёгкі хлеб ці мо цяжкі —*
*Мастакі ёсць мастакі:*
*Часта іхнія фінансы*
*Напяваюць ім рамансы —*
*На любыя галасы...*
*Так было ва ўсе часы.*
*...Выйсце? Ёсць!*
*Аўкцыён:*
*— Каму зімка?*
*За мільён?*

Пытаецца пра гэта **спадарыня Іна Алісевіч з Узденшчыны**.

Другая прычына, па якой спадары-гаспадары не будуюць дамы (нават для вельмі каханых!), — звычайнае гультайства. Паводле аднаго стараватага анекдота, жонка чарговы раз пытае ў мужа: «Ну калі ты ўжо дзверы ў прыбіральні паставіш?» Ён у адказ: «А што там красці?»

Там і сапраўды... А вось у майстэрні... Злодзей, які захрас у фортцы на першым паверсе, у міліцыі не змог растлумачыць, дзе яго збілі — на вуліцы ці ў кватэры. А колькі яшчэ «не збітых», не злоўленых?! Не вам казаць:

*Калі раптам пільнасць*
*мастака пакіне,*
*То прыладзяць ногі*
*не адной карціне!*

Дарэчы, яны, тыя ногі (можна яшчэ раз глянуць на здымак) здзівілі не толькі **спадарыню Іну**. Карціна, якая ходзіць, уразіла і **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды**, які паглядзеў на яе вачыма даішніка:

*Паставы — разявіў рот,*
*Вонкі лезуць вочы:*
*Сярод дня, на пераход...*
*Дрэвы цугам крочаць.*
*Нават піва ён не піў*
*І не знаў знямогі,*
*Але ж бачыць —*
*не прысніў:*
*Гурбы маюць ногі!*

Хто іх «прырабіў»? Не вам казаць, ёсць такія спецыялісты, нават «мастакі». Пра іх якраз і піша **спадар Мікалай Старых з Гомеля**: «У рэпертуары гурта «Крамбамбуля» была жартоўная песня «Госці» і там такія радкі (прыводжу на слых):

*А з музею госці ўпотай*
*Знеслі пару кулямётаў.*
*Кажуць:*
*«Гэта нам карысна*
*У змаганні*
*з глабалізмам».*

Конкурсны здымак, — працягвае **спадар Мікалай**, — натхніў мяне на працяг гэтай песні:

*Ну а што было далей?*
*Госці зноў пайшлі*
*ў музей,*
*Пабылі там тры хвіліны,*
*Спрытна выкралі*
*карціну.*
*Калі ўдасца з ёй*
*схавацца,*
*Будуць з кліматам*
*змагацца.*

Пераможуць ці не — справа дзясятая, але ж паспрабуюць, таму што трэба нешта рабіць, бо (паводле **спадара Віктара Сабалеўскага**):

*«На лыжню б...» —*
*наш Янка марыць,*
*А зямля — без снегу,*
*І мароз не ўладарыць —*
*Можна ў тэпцях бегаць...*
*Пра зіму такім пейзажам*
*Небу нагадаем:*
*Можа снегу трохі ляжа?*
*Толькі б не ў маі!*

Пра яго ж, той памятны, леташні, і радкі **спадара Міколы Кісяля з Мінска**:

*Тут не дзіва і не цуд:*
*Валакуць зіму на суд,*
*Бо за дурняў нас трымае:*
*То не йдзе, а то — у маі.*

На жаль, не ў памяці, што канкрэтна абяцалі тады сіноптыкі?..

А зрэшты, якая розніца, бо яны ж ніколі не памыляюцца: яны проста блытаюць дату і месца. Адкуль, як прызнае **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**:

*Зноў сіноптыкі*
*ў праколе,*
*Таму й твары пахавалі:*
*Ні сняжыначкі на полі*
*(Яны гурбы абяцалі)...*
*Ну й цярплівы мой*
*народ,*
*Бо вось так —*
*не першы год.*

Зменам у клімаце, у порах года прысвяцілі свае прыгожыя радкі (варыянты подпісаў да здымка) і іншыя аўтары. **Спадарыня Валянціна Гудачкова**:

*Зіма забавілася дзесьці:*
*Прыйсці да нас —*
*не блізкі свет.*
*Але ж адправіла*
*прынесці*
*Тым, хто чакае,*
*свой партрэт.*

**Спадарыня Наталля Шкут з вёскі Прудок Светлагорскага раёна**:

*Не парушаючы*
*правілы руху*
*Ціха, па зебры,*
*крочыць зіма.*
*Хай забірае з сабой*
*завіруху,*
*Снег ды мароз...*
*Хай прыходзіць вясна!*

І сапраўды, хай, бо мае рацыю **спадарыня Ніна Галкоўская з Гродна:**

*Час маланкай*
*пралятае —*
*Не паспееш і міргнуць:*
*Толькі зімачку віталі,*
*А глядзі —*
*хаваць нясуць.*

Яе, зімку?

У **спадарыні Гудачковай** наконт гэтага ёсць сумненні:

*У раме — позняя зіма?*
*Ці то ранняя вясна?*
*Для мяне важней*
*не гэта:*
*Больш за ўсё чакаю лета!*

І ці варта пісаць чаму? Хіба што прывесці радкі **спадарыні Алісевіч**:

*Бізнес рэзка сеў на мель:*
*Не чакай нас,*
*Куршавель!*
*Суцяшальны прыз*
*для жонкі —*
*Віды зімняе старонкі.*

Хай любуецца — яна. Што да нас, то, паводле **сужэнцаў Астроўскіх з Мінска**:

*Мы*
*ў край наш улюбёны,*
*На ўвесь свет*
*такі — адзіны,*
*Што любы куток ягоны*
*Так і просіцца ў карціны!*

Вось мастакі і шчыруюць, прычым не толькі ў майстэрнях. Як лічыць **спадарыня Вараб'ёва з Асіповічаў**:

*Мала твор намаляваць, —*
*Трэба ж людзям*
*паказаць,*
*Аплаціць арэнду залы,*
*Ці паставіць —*
*ля вакзала...*

Куды, паводле **спадара Івана Сіманёнка з Пастаў**, гэты шэдэўр і «крочыць»:

*Мегаполісны пейзаж*
*Хлопцы ажывілі,*
*Саматужны вернісаж*
*Да Каляд адкрылі.*
*Малявалі тры гады,*
*Неслі — пешым ходам*
*Даказалі: сапраўды*
*Мастакі — з народам!*

І былі, і ёсць, бо, на думку **спадара Сабалеўскага**:

*Чуюць хлопцы:*
*«Супер!», «Брава!»...*
*І няхай іх дождж лупцуе*
*Перасоўная выстава*
*Пяты дзень ужо працуе!*

А магла ж (як лічыць **спадарыня Чыгрынава з Мінска**) і... не адкрыцца, бо:

*Не ўлазілі карціны*
*Ні ў трамваі,*
*ні ў машыны...*
*Тут як тут Валодзя*
*і Вася,*
*Што заўсёды на падхваце:*
*Іх тандэм не дужа танны,*
*Ды не знойдзеце ж*
*заганы:*
*Не паломяць, не паб'юць,*
*Калі толькі... не зап'юць!*

Ці — паводле **спадара Сабалеўскага** — не пойдуць у чарговы загул:

*Па любошчах сакавіцкіх*
*Мужыкі засумавалі:*
*Сталі мроіцца ды сніцца*
*Маладзічкі,*
*дзеўкі-кралі...*
*Не спалохаць іх*
*лупцоўкай,*
*Калатнеча — не чакае:*
*Ёсць ад жонак*
*маскіроўка*
*Крэатыўная такая!*

Ну сапраўды: добра ж схаваліся... Могуць, як той казаў, і з лаўкі зваліцца і нічога не пабіць... Каб, паводле **спадарыні Любові Чыгрынавай**, забяспечыць дабрабыт сям'і:

*— Кватэрка малая,*
*Такая ж зарплата, —*
*Жонка пілуе:*
*Жывём небагата.*
*А муж яе — аспід:*
*— Карціну куплю,*
*Як стане шэдэўрам,*
*Тады й зараблю.*

Што трэба, каб стала? Ну, вядома ж, каб намаляваў і прадаў яе па-сапраўднаму таленавіты мастак, каб ён (свят-свят-свят!) памёр, каб пасля гэтага прайшлі гады, а то і дзесяцігоддзі...

Але ж не ў традыцыях рубрыкі завяршаць чарговы агляд на сумнай ноце — тым больш — калі ў пошце конкурсу ёсць іншыя: **спадарыня Ніна Бурко з Бярэзіншчыны** піша:

*«Хто каго?» —*
*для нас не гулі*
*З рыфмаваннем*
*пэўных слоў, —*
*Для дзяцей і для бабулек*
*Гэта трэнінг для мазгоў,*
*Асалода ад чытання,*
*Часам смех —*
*ажно да слёз!*
*І здзіўленне, і яднанне,*
*І...*
*навек бывай, склероз!*

Вы таксама хацелі б з ім развітацца (альбо не сустракацца)? Тады ўважліва глядзіце на ніжні здымак, прыдумвайце подпіс — дасціпны, кароткі (не больш за восем радкоў) — і дасылайце ў рэдакцыю. А ўжо тут цалкам магчымы... абмен: вы нам — найлепшы подпіс, мы вам — прыз у выглядзе квартальнай падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду».

Вось тут і цяпер варта нагадаць, што сярод яго пераможцаў (конкурсу хутка 18!) былі многія з сённяшніх аўтараў: у прыватнасці, **спадарыні Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, Любоў Чыгрынава і сужэнцы Астроўскія з Мінска, Ніна Бурко з Бярэзіншчыны, спадары Мікалай Старых з Гомеля, Валерый Гаўрыш з Чавусаў, Віктар Сабалеўскі з Узды...**

Цікавыя радкі, на думку і вялікага чытацкага, і малога рэдакцыйнага журы, прапанавалі яны і да мінулага здымка, дзе, нагадаем, былі «хлопцы ў лодцы», якія замест вёслаў «грэблі» рыдлёўкамі *(гл. нумар «Звязды» за 12.12.2017)*. Сябрам (каб не казаць членам) абодвух журы было ў выніку над чым падумаць! А ўрэшце прызнаць найлепшымі радкі:

*Не шкадуе Бог багатых,*
*Ім таксама шле бяду:*
*Грэблі грошыкі лапатай,*
*А цяпер грабуць ваду.*

Так што віншуем пераможцу — **спадарыню Веру Жук з Гродна**! Ёй жа і ўсім аўтарам — шчыра дзякуем... І жадаем: «Хай мацнее год ад года звяз газеты і народа!» — людзей, якія не толькі выпісваюць «Звязду», але і пішуць — у тым ліку вершаваныя радкі да здымкаў. Чарговы — як заўжды дадаецца, на роздум.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж заўсёдныя і шчырыя прабачэнні тым, чые радкі на гэты раз не прайшлі досыць строгага адбору, а ўжо ў наступны...**

**Як той казаў, хто не гуляе, той не выйграе. Ці не так?**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# БАБУЛІН ЗАПЛЫЎ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й старонцы.)*

Час мае сваю памяць — гісторыю. І дапамагае захоўваць гэтую гісторыю не што іншае, як фатаграфія. Падзея, пра якую я хачу расказаць, ужо стала гісторыяй, але здымкі нагадваюць мне пра яе і вяртаюць у незабыўную атмасферу спартыўнага азарту.

Гэтай зімой давялося фатаграфаваць незвычайныя спаборніцтвы — плаванне ў ледзяной вадзе. Гэта быў этап Кубка свету па зімовым плаванні, які першы раз праходзіў у Мінску. У тыя дні якраз стаяла марознае надвор'е, на градусніку было 10 градусаў са знакам мінус. Але ні іней на дрэвах, ні пара, якая ішла ад вады, не бянтэжылі ўдзельнікаў у адных плаўках і купальніках.

Мне трэба было перадаць атмасферу спартыўнага свята. Здзівіла тое, што разам з маладымі мужчынамі-плыўцамі былі і прадстаўніцы прыгожай паловы. Больш за тое, на стартавую дарожку выходзілі... бабулі. Некаторым з іх было далёка за 60! Многія з іх прыехалі ў беларускую сталіцу з Расіі, Украіны, Латвіі, Эстоніі і іншых краін, каб паказаць сваю сапраўдную загартоўку. З якім пазітыўным настроем бабулі-«маржы» ішлі на свой чарговы заплыў і давалі нырца ў ледзяную ваду! Суддзі, гледачы і мы — журналісты, фатографы і тэлевізійнікі, — захутаўшыся ў цёплыя курткі і надзеўшы пальчаткі, са шчырым здзіўленнем паглядалі на амбіцыйных, адважных і гордых прыгажунь.







З размовы з 72-гадовай Рымай Васяльчук *(яе фота на першай старонцы)* я даведалася, што плыўчыха прыехала з расійскага Арла па чарговую ўзнагароду, на яе рахунку ўжо 130 медалёў. І самае галоўнае, што я пачула, — дзякуючы маржаванню гераіня даўно забылася пра свае хваробы.

Не хаваючы эмоцый, я мімаволі пазайздросціла гэтым жанчынам-экстрэмалкам. З якім настроем ставяцца яны да свайго «халоднага» захаплення! Паглядзеўшы на гэтыя здымкі, нехта захоча змяніць жыццё і паспрабаваць сябе ў такой незвычайнай ролі. А чаму б і не?!

**Ганна ЗАНКАВІЧ,**
**фота аўтара.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Лот №1.** Изолированное помещение с инв. №200/D-86161, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение площадью 7 739 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проспект Фрунзе, 83. Обременение: ипотека ОАО «Приорбанк». Имущество обращено в доход государства у ООО «ОСТБЕЛИНВЕСТ» (УНП 190136471). **Нач. цена:** 1 339 200 рублей. **Задаток:** 133 920 рублей.

**Условия:** 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен Управлением по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь но не более чем на 20 рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **www.marketvit.by**. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенная доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи; организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе); организациями и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на русский или белорусский языки; представителями организаций и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Аукцион состоится 12.03.2018 в 11.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** в рабочие дни с 07.02.2018 с 8.30 по 07.03.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 7). **Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | – Капитальное строение инв. № 400/С–69051 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), площадью 220,4 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/2.<br>– Капитальное строение инв. № 400/С–69021 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 243,9 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/1.<br>– Капитальное строение инв. № 400/С–69106 (назначение – здание многофункциональное), площадью 1209,3 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К.<br>– Капитальное строение инв. № 400/С–97342 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 2070,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий столярной мастерской, блока складов и механического цеха, склада КиПа.<br>– Капитальное строение инв. № 400/С–97348 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 68,6 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока складов и механического цеха.<br>– Капитальное строение инв. № 400/С–97337 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью 81,3 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая канализационная сеть к блоку складов.<br>– Капитальное строение инв. № 400/С–97332 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 104,5 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к блоку складов и механическому цеху.<br>– Капитальное строение инв. № 400/С–97387 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ), протяженностью 228,7 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП–10кВ до ТП–3 до ТП–4.<br>– Капитальное строение инв. № 400/С–97379 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 61,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к блоку складов и механическому цеху.<br>– Капитальное строение инв. № 400/С–85886 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – тепловая сеть (внеплощадочная)) протяженностью 343,9 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>– шкаф распределительный ПР–24–7208;<br>– трансформаторная подстанция 2 РТ 1000/10 № 1;<br>– распределительный пункт ПР–24–11–7205;<br>– трансформатор масляный силовой ДУ–ТМЗ–1000/10 ТП–2;<br>– трансформатор масляный силовой ДУ–ТМЗ–1000/10 ТП–2;<br>– распределительный пункт ПР–24–7210–54УЗ;<br>– теплосчетчик ТС–07ХХ–88 «Струмень»;<br>– туя (1 единица) |
| Земельный участок, на котором расположен объект | – кадастровый номер 440100000002008242, площадью 0,9480 га (назначение – для обслуживания зданий столярной мастерской (инвентарный номер 400/С–69051), блока складов и механического цеха (инвентарный номер 400/С–69106), склада КиПа (инвентарный номер 400/С–69021)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 К;<br>– кадастровый номер 440100000002006868, площадью 0,0007 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>– кадастровый номер 440100000002006869, площадью 0,0007 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>– кадастровый номер 440100000002006871, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>– кадастровый номер 440100000002006872, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>– кадастровый номер 440100000002006873, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; |
| Земельный участок, на котором расположен объект | – кадастровый номер 440100000002006874, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>– кадастровый номер 440100000002006875, площадью 0,0037 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>– кадастровый номер 440100000002006876, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>– кадастровый номер 440100000002006877, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>– кадастровый номер 440100000002006878, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>– кадастровый номер 440100000002006879, площадью 0,0312 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 |
| Начальная цена продажи | 538 120,51 руб. (пятьсот тридцать восемь тысяч сто двадцать рублей пятьдесят одна копейка) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 26 906 руб. (двадцать шесть тысяч девятьсот шесть рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия оплаты | возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 3 % от конечной цены продажи объекта |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 12 марта 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 5 марта 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45–05–38, 41–98–32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## Извещение о проведении 26 февраля 2018 года повторных торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, местонахождение продаваемого имущества)** | Изолированное помещение № 36 с инвентарным номером 610/D-10646, расположенное по адресу: г. Борисов, ул. Демина, 39 |
| **Начальная цена** | 10 562,89 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 1 056,28 бел. руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», 220030 г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 26 февраля 2018 года в 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

